незалежная газета

№ 18 (616) 13 мая 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Выратаваць Аўтуховіча

Старонка 4



## Абельская выедзе з Беларусі?

Старонка 9

## Палітбюро-2009: Сяргей Ткачоў

Старонка 8



У НУМАРЫ

**БХД не зарэгістравалі**

Цягам месяцу партыя мае абскардзіць рашэнне ў Вярхоўным судзе. **Старонка 2.**

**Новы твар Літвы**

Прэзідэнтам Літвы можа стаць «жалезная ледзі». **Старонка 3.**

**Дачка камбрыга Бумажкова — Лукашэнку**

«Вы ведзяце псіхалагічную вайну супраць народу». **Старонка 7.**

**З Койданаўскага гета ў латышскае СС**

Як габрэйскі хлопчык стаў сімвалам нацысцкай прапаганды — «самым маладым жаўнерам Рэйху». **Старонка 13.**

**Ад мамантаў спакон вякоў**

Цытаты тыдня. **Старонка 5.**

### ARCHE ў Гродне

**28 мая ў Гродне ў памяшканні Таварыства беларускай школы (вул.- Будзённага, 48а-44)** пройдзе прэзентацыя спецыяльнага нумару часопісу ARCHE, прысвечанага БНР. Удзел бяруць рэдактар часопіса Валер Булгакаў, а таксама гісторыкі Алесь Пашкевіч і Андрэй Чарнякевіч. **Пачатак у 18.30.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Усё хакей

Беларусь гуляла на роўных з Расіяй у Швейцарыі і прыме чэмпіянат свету 2014 году.




**Маглі б і лепей. Заўзятары ў часе матчу Беларусь-Расія перад экранам каля Палацу спорту.**

# Ціхая вада «Партнёрства»

У Празе дадзены старт праграме еўраадаптацыі шасці краінаў былога СССР.

Беларусь, як і прагназавалася, прадстаўлялі на спатканні віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка і міністр замежных справаў Сяргей Мартынаў. На кантакты з прэсай яны не ішлі. Нават не трапілі на агульны здымак удзельнікаў саміту.

Дарэчы, у будынак, дзе праходзіла пасяджэнне, абодва чыноўнікі накіроўваліся пад крыкі «Ганьба» і «Жыве Беларусь». Гэта беларуская дыяспара зладзіла невялікае пікетаванне. Больш ніхто ў Празе ў гэты дзень не пратэставаў.

Як стала зразумела, у асноўным супрацоўніцтва ў рамках праграмы будзе адбывацца ў выглядзе двухбаковых дачыненняў, якія краіны павінны выпрацаваць міжсобку. У Беларусі пакуль няма такіх пагадненняў з іншымі краінамі-удзельніцамі.

Цікава, што нават абяцанні пра змякчэнне візавага рэжыму ў дачыненні шасці постсавецкіх краінаў не выглядаюць так аднаназначна. «Еўрасаюз зробіць паступовыя крокі да поўнай лібералізацыі візавага рэжыму сваёй доўгатэрміновай мэтай у адносінах да асобных краінаў-партнёраў на аснове індывідуальнага падыходу», — напісана ў выніковым тэксце. А калі тое будзе — ніхто не сказаў.

Варта адзначыць, што на саміце не было не толькі Лукашэнкі, але і шэрагу кіраўнікоў краінаў Еўрасаюзу. Не прыехалі ў Прагу прэм'еры Вялікабрытаніі і Італіі Гордан Браўн і Сільвіё Берлусконі, а таксама прэзідэнты Францыі і Літвы Нікаля Сарказі і Валдас Адамкус. Той жа Францыі важнейшым падаецца паўднёвы (поўнач Афрыкі), а не ўсходні кірунак.

У цэлым саміт і прэзентацыя праграмы «Усходняга партнёрства» ў Празе 7 мая прайшлі ціха і амаль незаўважна. Маштаб і розгалас ад сустрэчы быў нашмат меншы, чым чакалася напярэдадні. І тым не менш, паўстаў праект, што стане фактычна процівагай СНД. Цяха вада плаціны рве, кажа прымаўка.

Ужо па сканчэнні саміту Міністэрства замежных справаў заявіла, што «Дэкларацыя «Усходняга партнёрства» адпавядае нацыянальным інтарэсам Беларусі».

У Празе была прадстаўленая і апазіцыйная дэлегацыя ў складзе Аляксандра Мілінкевіча, Аляксандра Казуліна, Зянона Пазняка, Станіслава Шушкевіча і Івонкі Сурвіллы.

**Працяг на старонцы 3.**



### Маршруты па Беларусі: над ракой Арэсай

Любаншчына. Тут ёсць крэйдавыя азёры, экспанаты пра ўнікальную камуну 1929-га. Гэта радзіма Сыракомлі і Шпілеўскага. **Старонка 11.**

# БХД не зарэгістравалі



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

12 траўня Міністэрства юстыцыі прыняло рашэнне не рэгістраваць партыю Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Як паведамляе Мін'юст, падчас вывучэння дакументаў, якія падаваліся для рэгістрацыі, было знойдзена, што спіс заснавальнікаў і пратакол устаноўчага з'езду маюць несапраўдныя звесткі. Міністэрства зазначае, што ў ліку заснавальнікаў ёсць асобы, якія не бралі ўдзелу ў зборах па вылучэнні дэлегатаў на з'езд і ў працы самога з'езду.

Некаторыя сябры БХД не змаглі назваць месца і дату правядзення збораў, на якіх яны прысутнічалі, колькасць удзельнікаў, а таксама каго яны абралі ў якасці дэлегатаў на з'езд.

«Нехта з супрацоўнікаў Міністэрства тэлефанаваў заснавальнікам БХД і задаваў па 10—15 пытанняў адносна правядзення з'езду. Вось пытаюцца: колькі было чалавек на пасяджэнні ў вашым раёне? Кажаце, дваццаць? Але ж іх было трыццаць. А колькі чалавек вылучалі на з'езд? Чатыры? А па дакументах пяць. На такіх рэчах і была абгрунтаваная адмова», — расказваў сустаршыня БХД П.Севярынец.

«Любы чалавек праз два месяцы пасля партыйных сходаў можа забыцца, колькі чалавек на ім прысутнічала і колькі вылучалася на з'езд, — кажа іншы сустаршыня БХД Аляксей Шэін. — Шмат да каго на працу прыходзілі супрацоўнікі спецслужбаў і чыноўнікі, якія ставілі ўмову: альбо подпіс заснавальніка, альбо праца. Напрыклад, такую ўмову паставілі шматдзетнай маці. Усё гэта рабілася, каб мець фармальныя прычыны для нашай нерэгістрацыі».

БХД ужо адмаўлялі ў рэгістрацыі 15 красавіка, але на наступны дзень раптоўна рашэнне было прыпыненае. Шмат хто звязваў гэта з прыездам у Мінск міністра замежных справаў Чэхіі Карэла Шварцэнберга.

«Аргкамітэт БХД будзе працягваць сваю працу як і раней. Думаю, рашэнні аб рэгістрацыі партый выходзяць за рамкі той касметычнай лібералізацыі, якая ў нас адбываецца», — кажа А.Шэін.

Цягам месяцу партыя мае права абскардзіць рашэнне ў Вярхоўным судзе, што і збіраецца зрабіць. Хоць вялікіх ілюзій на гэты конт ніхто не мае. «Пазней прымем рашэнне, ці праводзіць новы ўстаноўчы з'езд, бо настрой Мін'юсту нам і так зразумелы», — падсумоўвае А.Шэін.

**Зміцер Панкавец**

## НАВІНЫ СЦІСЛА

### Amnesty International прызнала фігурантаў «справы 14-ці» вязнямі сумлення

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International прызнала ўдзельнікаў «працэсу 14-ці» вязнямі сумлення. Пра гэта гаворыцца ў яе афіцыйным лісце на імя генпракурора Рыгора Васілевіча. Amnesty International пэўная, што яны былі пакараныя за ажыццяўленне права на свабоду сходаў і выказвання. Amnesty International — сусветны рух, ён яднае 2,2 млн чалавек, якія дамагаюцца спынення парушэнняў правоў чалавека.

### Цісnуць? Прызнавайце!

Пытанне аб статусе самаабвешчаных рэспублік Паўднёвая Асеція і Абхазія не з'яўляецца ўмовай развіцця адносінаў Беларусі і Еўрасаюзу. Пра гэта заявіў кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Мінску і Кіеве Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра 12 мая. Разам з тым, зазначыў дыпламат, той факт, што Беларусь «дагэтуль не прызнала незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, абнадзейвае». Тэйшэйра нагадаў, што Еўрасаюз «не прызнаў і не прызнае» незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Тым часам, беларуская дэлегацыя на чале з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімірам Макеем знаходзіцца з візітам у Абхазіі. У Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі візіт не каментуюць.

### Кіраўнік МЗС Славеніі плануе наведаць Мінск

Славенія будзе старшынстваваць у Радзе Еўропы ад 12 мая да 18 лістапада 2009 г. Візіт Самуэля Жбогара ў чэрвені прымеркаваны да адкрыцця інфармацыйнага цэнтру Рады Еўропы ў будынку Беларускага дзяржаўнага універсітэту ў Мінску.

### РПЦ: дамовімся без Лукашэнкі

«Расійскай праваслаўнай царкве і Рыма-каталіцкай царкве не патрэбныя якіясьці пасярэднікі для вырашэння такіх пытанняў, у іх ёсць магчымасці для правядзення простых узгадненняў», — заявіў намеснік старшыні Аддзелу замежных царкоўных сувязяў Маскоўскага патрыярхату. Так ён пракаментаваў нядаўнюю прапанову Аляксандра Лукашэнкі правесці сустрэчу Папы і Патрыярха на тэрыторыі Беларусі.

### КДБ арыштаваў галоўнага сышчыка

Супрацоўнікі КДБ пры падтрымцы Рады бяспекі арыштавалі начальніка Галоўнага ўпраўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці (ГУАВД) МУС палкоўніка міліцыі Івана Шышлу. Матывы арышту пакуль не паведамляюцца. За апошні месяц гэта ўжо трэцяя буйная аперацыя КДБ супраць кіраўнікоў МУС.

### Жудаснае забойства ў Мінску

10 траўня ў яры каля аднаго з дамоў на праспекце Дзяржынскага было знойдзенае цела дзяўчыны ва ўзросце 15—25 гадоў. Труп быў напалову спалены. Пачатая крымінальная справа паводле ч.1 арт. 139 КК (забойства). Абставіны і прычыны смерці высвятляюцца.

### Шукаюць падпальшчыка

Органы ўнутраных справаў шукаюць злачынцу, які ўчыніў 22 красавіка падпал сямі леціщчаў у Валожынскім раёне на тэрыторыі дачна-садовага таварыства «Выток-Сувязь» паблізу вёскі Туркаўшчына. Міліцыю цікавіць інфармацыя ад відавочцаў, напрыклад, тых, хто здымаў пажар на фота- або відэаапаратуру.

### Халады вяртаюцца

13 мая на большай частцы тэрыторыі краіны дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ноччу плюс 1—7°С, днём плюс 7—13°С, па паўднёвым захадзе да плюс 15°С. 14 мая па ўсходняй палове кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ноччу плюс 1—6°С, месцамі па захадзе замаразкі ад 0 да мінус 3°С, днём плюс 6—13°С, па паўднёвым захадзе да плюс 16°С.

**СМ; БелаПАН, «Ежедневник»**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Мікалаю В.** з Белаазёрску
**Ірыне Ц.** З Жыткавічаў
**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.
**Антону Б.** з Верхнядзьвінску
**С.К.** з Пінску
**Віктару К.** з Рэчыцы
**Яўгенію К.** з Віцебску.
**Н.Х.** з Шчучыну
**Л.А.** з Полацкага раёну.
**Леакадзіі Н.** з Ракава
**Юрасю Ч.** з Мазыра
**Валерыю П., Алесю Б.** з Баранавіцкага раёну.
**Аляксандру Л.** з Гомелю.
**Сьвятлане К.** з Ліды.

# Ціхая вада «Партнёрства»

Працяг са старонкі 1.

Паводле Мілінкевіча, толькі міністр замежных справаў Іспаніі Марацінас выказваецца за супрацу з Беларуссю без усялякіх умоваў. «Прапануйце канкрэтныя тэхналогіі, прапануйце, што зрабіць, каб сітуацыя палепшылася, а не займайцеся простай фіксацыяй парушэнняў правоў чалавека», — звяртаецца А.Мілінкевіч да калегаў у апазіцыйным асяродку.

На пытанне карэспандэнта «НН», ці не шкадуе Мілінкевіч, што на праскі саміт не прыляцеў Лукашэнка, быў наступны адказ: «Ёсць шкадаванне. Я хачу, каб Беларусь была прадстаўленая на самым высокім узроўні, але Лукашэнка сваёй дзейнасцю за апошнія шэсць месяцаў не заслужыў такога запрашэння. Мала крокаў зроблена. І ўлада павінна разумець, што не будзе эканамічнага супрацоўніцтва, фінансавай падтрымкі, калі не будзе канкрэтных зменаў».

Зянон Пазняк выказаўся пра падпісанне праграмы «Усходняга партнёрства» інакш: «Гэта падзея, якая патрабуе грунтоўнага асэнсавання. Бо, здаецца, не ўсе ўсведамляюць, наколькі небяспечны паварот адбываецца ў еўрапейскай палітыцы. «Усходняе партнёрства» дае беларусам магчымасць манёўру ў выпадку абвастрэння палітычнага і эканамічнага націску з боку Расіі. Праграма прадугледжвае верагоднасць уцягвання беларускага грамадства ў сферу еўрапейскіх дачыненняў. Аднак «Партнёрства» запраграмаванае на супрацоўніцтва ЕС з антыбеларускім рэжымам. Калі пачнуцца інвестыцыі з Еўропы і сумесныя энергетычныя праекты, размовы пра дэмакратыю і правы чалавека скончацца (яны ўжо, фактычна, скончыліся)».

«Усходняе партнёрства» прынятае, але рэальным зместам яго яшчэ трэба будзе запоўніць.

**Зміцер Панкавец**



**Мірэк Тапалянек, Уладзімір Сямашка і Карэл Шварцэнберг перад пачаткам саміту.**

# Сіліцкі: Само запрашэнне яшчэ нічога не значыць

У часе саміту «Усходняга партнёрства» ў Празе прысутнічаў палітолаг, дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў (BISS) Віталь Сіліцкі. Ён адказаў на пытанні карэспандэнта «НН».

**«Наша Ніва»: Чаго Беларусі можна чакаць ад удзелу ва «Усходнім партнёрстве», як удзел у гэтай ініцыятыве можа адбіцца на нашай краіне?**

**Віталь Сіліцкі**: Сам факт запрашэння Беларусі ва «Усходняе партнёрства» пакуль нічога не азначае. Усе практычныя праекты, прадугледжаныя ў праграме, «завязаныя» на прынцыпе абумоўленасці. Гэта значыць, што Еўрасаюз будзе лібералізаваць гандаль, адмяняць візы, падпісваць дамовы пра асацыяцыю (і калі гэта яшчэ будзе) толькі з тымі краінамі, якія будуць рухацца па шляху палітычных і эканамічных рэформаў. У той жа час, партнёрства прадугледжвае інтэнсіўнае шматбаковае ўзаемадзеянне па шэрагу так званых «флагманскіх» праектаў (накіраваных на памежнае і энергетычнае супрацоўніцтва, развіццё малога і сярэдняга бізнесу), што азначае як магчымыя эканамічныя ініцыятывы, так і інтэнсіфікацыю шматбаковых кантактаў паміж чыноўнікамі, адмыслоўцамі, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці.

**Віталь Сіліцкі**

доктар палітычных навук, дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў (Вільня).

Працяг на старонцы 5.

# Аляксей Янукевіч: БНФ трэба новыя твары, але гэта не рэвалюцыя

У верасні мае прайсці наступны з’езд Партыі БНФ. Старшыня арганізацыі Лявон Баршчэўскі неаднаразова заяўляў, што сыдзе ў адстаўку. Першым, хто заявіў пра гатоўнасць заняць крэсла старшыні, стаў намеснік Баршчэўскага, 32-гадовы **Аляксей Янукевіч**.

**«Наша Ніва»: Год таму ты казаў, што яшчэ не вызначыўся, ці будзеш вылучацца на пасаду старшыні Партыі БНФ.**

**Аляксей Янукевіч**: Ужо прынятае канчатковае рашэнне, я вылучаюся.

**«НН»: І што паўплывала на рашэнне?**

**АЯ**: Сітуацыя ў краіне настолькі імклівая мяняецца, што існаваць так, як Фронт існаваў апошнія гады, няма ніякай магчымасці. Важна прыцягнуць у партыю новых людзей з новымі ідэямі. Прыход новай асобы, якая не ідзе на адкідання фронтаўскай спадчыны, а выступае за абнаўленне БНФ, будзе добрым сігналам грамадству.

**«НН»: Якое месца ты адводзіш БНФ унутры грамадства ў цэлым і апазіцыі ў прыватнасці?**

**АЯ:** Перад кожнай партыяй цяпер стаіць нялёгкі выбар. Ёсць шлях пайсці на супрацоўніцтва з рэжымам, як абазначыў гэта Ляўковіч; другі шлях — схавацца з галавой пад коўдру, не заўважаць зменаў у грамадстве і навокал Беларусі. Лічу, для БНФ абодва гэтыя шляхі непрымальныя. Сіла БНФ у дынамічнасці і здольнасці адэкватна рэагаваць на выклікі часу. Трэба выкарыстоўваць магчымасці, якія будуць адкрывацца ў звязку з крызісам і гульнямі ўладаў з Еўропай, для ўмацавання Фронту. Мы павінны вярнуцца да адпаўлення вобразу БНФ, як партыі якую падтрымлівае нацыянальная эліта, за якой будучыня. Як моцнай партыі, здольнай эфектыўна бараніць свае каштоўнасці.

**«НН»: Хто табе бачацца галоўнымі хаўруснікамі БНФ?**

**АЯ**: Вялікае дыскусійнае пытанне пра стасункі з Рухам за Свабоду і Аляксандрам Мілінкевічам. Калі нават Пазняк гатовы паразумецца з Мілінкевічам па найбольш значных пытаннях, было б недарэчна, каб гэта не змог зрабіць БНФ. Мілінкевіч не ідэальны палітык і робіць досыць шмат памылак. Але супрацьстаянне аслабляе БНФ, і адкладае вырашэнне важнай задачы Фронту — змены цяперашняга рэжыму. Таксама БХД. З традыцыйных партнёраў — АГП. Іншыя суб’екты, якія вызнаюць блізкія нам каштоўнасці.

**«НН»: Твае вылучэнне нельга разглядаць як бунт наймаладзейшага пакалення?**

**АЯ**: Ні ў якім разе. Гэта не рэвалюцыя. Я б назваў гэта пачаткам новага этапу развіцця.

**«НН»: БНФ гатовы супрацоўнічаць з уладамі?**

**АЯ**: Сёння ўлады не збіраюцца супрацоўнічаць з апазіцыяй. Мы павінны клапаціцца аб тым, каб стаць моцнымі. Каб супрацоўніцтва адбывалася не па волі Лукашэнкі, а праз запатрабаванасць з боку грамадства.

**«НН»: Наколькі для цябе важная наяўнасць фронтаўскага кандыдата на наступных прэзідэнцкіх выбарах?**

**АЯ**: Цягам некалькіх апошніх гадоў я найбольш паслядоўна выступаў за абавязковае вылучэнне кандыдата БНФ. Аднак сёння ўсё не так адназначна. Унутранае абмеркаванне будзе, і будзе партыйнае рашэнне, я не хацеў бы яго апярэджваць. Але, калі партыя вырашыць падтрымаць Мілінкевіча, напэўна, гэта будзе самым разумным варыянтам у сённяшняй сітуацыі. Каб адкінуць спекуляцыі, хачу падкрэсліць: мы не будзем працаваць на тэхнічнага кандыдата, але толькі на таго, хто будзе кідаць рэальны выклік Лукашэнку. Гэта тычыцца любога, у тым ліку і Мілінкевіча. Падтрымку БНФ Мілінкевіч павінен атрымаць толькі ў тым выпадку, калі ён будзе рэальна змагацца за змену палітычнага рэжыму, калі не будзе пазбягаць атакаваць Лукашэнку.

**Гутарыў ЗП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксей Янукевіч**

нарадзіўся ў 1976 годзе ў мінскай Чыжоўцы. У 1997 скончыў факультэт міжнародных эканамічных адносінаў БДЭУ па спецыяльнасці эканаміст-менеджэр. Намеснік старшыні Партыі БНФ ад 2003.

# Новае аблічча Літвы

17 мая пройдзе першы тур прэзідэнцкіх выбараў у Літве.

Яго можа хапіць для абрання прэзідэнта. Цэнтравыбаркам Літвы зарэгістраваў сем кандыдатаў, сярод якіх тры жанчыны і адна яўны фаварыт — былая еўракамісар Даля Грыбаўскайтэ.

Яна нарадзілася 1 сакавіка 1956 году ў Вільні. Вучылася на вячэрнім аддзяленні эканамічнага факультэту Ленінградскага ўніверсітэту. Скончыла ВНУ ў 1983 г. Падчас вучобы адначасова працавала на футравай фабрыцы «Рот-Фронт». Пасля выкладала палітэканомію ў Віленскай вышэйшай партыйнай школе. У 1991 г. навучалася па праграме для кіраўнікоў у Інстытуце міжнародных эканамічных зносінаў Джорджтаўнскага ўніверсітэту (ЗША).

Ад развалу Савецкага Саюзу і пачаўся палітычны ўзлёт Грыбаўскайтэ. Яна ўзначальвала еўрапейскі дэпартамент міністэрства міжнародных эканамічных адносінаў, потым — аналагічнае ведамства ў МЗС, была паслом Літвы пры Еўрасаюзе, паўнамоцным міністрам у пасольстве Літвы ў ЗША, узначальвала Мінфін ва ўрадзе Бразаўскаса.



Пасля стала камісарам, адказным за фінансавае планаванне і бюджэт у Еўракамісіі. На гэтай пасадзе да Далі Грыбаўскайтэ прыйшла папулярнасць.

Яе называлі літоўскай «жалезнай ледзі». Яна рэзка крытыкавала эканамічную палітыку ўраду, за што нават неаднаразова абвінавачвалася ў палітыканстве.

Калі Грыбаўскайтэ дала згоду ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, інтрыга памерла амаль адразу ж — такая яе папулярнасць. Літоўцы звязваюць з прыходам да ўлады гэтай энергічнай жанчыны надзеі на выхад з эканамічных цяжкасцяў. Часам яе называюць «літоўскім Баракам Абамам», што таксама шмат аб чым гаворыць.

Даля Грыбаўскайтэ, апроч літоўскай, валодае англійскай, польскай, французскай і расійскай мовамі. Не замужам.

У выпадку перамогі Даля Грыбаўскайтэ стане чацвёртым прэзідэнтам Літвы ад 1991 г. А таксама другой жанчынай-прэзідэнткай на постсавецкай тэрыторыі. Першай у Латвіі была Вайра Віке-Фрэйберге.

**ЗП**

# Выратаваць Аўтуховіча

**Ваўкавыскі прадпрымальнік працягвае ў СІЗА бестэрміновую галадоўку пратэсту, якую пачаў 16 красавіка. Незалежнае грамадства робіць рашучыя крокі, каб вызваліць Аўтуховіча і яго сяброў Лявонава і Асіпенку з турмы.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Спроба захопу Паўла Юхневіча (другі справа) міліцыянтамі ў цывільным пасля акцыі на Кастрычніцкай плошчы.**

«Аўтуховіч адчувае сябе вельмі дрэнна. Вельмі дрэнныя аналізы. Пачынаюцца праблемы з пячонкай. Але мае намер галадаць да канца», — кажа яго адвакат Павал Сапелка, адзіны, хто можа бачыцца са зняволеным. Мікалаю, які падазрaецца ў падпалах і падрывах дамоў ваўкавыскіх чыноўнікаў, не дазваляюць сустрэцца нават са сваякамі.

Акцыі салідарнасці са зняволенымі ваўкавысцамі набываюць рэзкія формы. Другі тыдзень ва Управе Партыі БНФ у Мінску галадаюць маладафронтаўцы. Моладзь патрабуе вызвалення Аўтуховіча і затрыманых з ім. Ад пачатку трымаюць галадоўку Наста Палажанка, Мікола Дземідзенка і Арцём Дубскі. Некаторыя, як Андрусь Цянюта, выходзяць з галадоўкі, але далучаюцца новыя ўдзельнікі: Кацярына Салаўёва, Ірына Губская, Яўген Скрабец.

Да галадоўнікаў звярталася старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла. Яна заклікала моладзь спыніць акцыю пратэсту: «Усім сэрцам я з вамі, але калі галадоўка вас зняможа, будзе гэта на карысць тых, хто давёў вас да такога стану».

На гэта Наста Палажанка адказала: «Мы распачалі галадоўку дзеля таго, каб нашы патрабаванні былі выкананыя. І таму мы не скончым галадоўку, пакуль не будзем мець пэўных вынікаў».

Звярнуўся да Лукашэнкі ў справе Мікалая Аўтуховіча і лідэр Руху за Свабоду Аляксандр Мілінкевіч. «Справа ваўкавыскіх прадпрымальнікаў набыла міжнародны рэзананс, бо расцэньваецца міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі, як, магчыма, палітычна матываваны пераслед. Каб выратаваць жыццё Мікалаю Аўтуховічу і ў мэтах паляпшэння іміджу нашай краіны, прашу Вас здзейсніць акт добрай волі і, дзеля забеспячэння належных правоў і законных інтарэсаў згаданых грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, паспрыяць неадкладнаму пачатку адкрытага судовага разбіральніцтва па дадзенай справе або змене меры ўтрымання для Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі», — гаворыцца ў заяве.

На мінулым тыдні штодня на Кастрычніцкай плошчы стаяла моладзь з партрэтамі ваўкавысцаў. Некалькі разоў спецназ затрымліваў пратэстоўцаў, але на наступны дзень людзі ўсё адно выходзілі. Адным з актыўных удзельнікаў тых акцый салідарнасці быў лідэр незарэгістраванай арганізацыі «Еўрапейская Беларусь» Павал Юхневіч:

«Мы дабіваемся вызвалення альбо пачатку суду над Аўтуховічам. Таксама стаіць пытанне проста выратаваць чалавеку жыццё. Трэба звярнуць увагу людзей на гэтую тэму як у Беларусі, так і за яе межамі. Бо, на жаль, у Еўропе апошнім часам вельмі часта гавораць, што палітвязняў у Беларусі не засталося. Але ёсць Аўтуховіч, ёсць асуджаныя ўдзельнікі «Працэсу чатырнаццаці». Гэтых жа мэтаў дабіваецца і «Малады фронт», калі пайшоў на мужны і адчайны крок галадоўкі, — кажа П.Юхневіч. — Дадзеныя падзеі паказваюць, што апазіцыя не кідае сваіх у бядзе».

**ЗП**

**Справа Аўтуховіча**

Мікалай Аўтуховіч — ваўкавыскі прадпрымальнік. Быў гаспадаром фірмы таксі «Ніка–транс», балатаваўся на парламенцкіх выбарах. У 2006 асуджаны на 3,5 гады турмы, нібыта за нясплату падаткаў. Прызнаны вязнем сумлення. Абвяшчаў галадоўкі пратэсту (да 74 дзён). Страціў 40 кг вагі. На волю выйшаў у студзені 2008, пад ціскам ЗША і ЕС.

Паўторна арыштаваны 8 лютага 2009. Яго вінавацяць у парушэнні арт.218 ч.3 КК «Наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці, здзейсненыя арганізаванай групай» ( ад 7 да 12 гадоў турмы). У 2004 у Ваўкавыску насамрэч былі падпалы дамоў начальніка РУУС Кацубы і падатковага інспектара Мандзіка, але па гэтых злачынствах ёсць асуджаныя, якія адбываюць зняволенне.

# Калегія аблсуду адмяніла рашэнне раённага суду аб прызнанні нумару ARCHE экстрэмісцкім

**Справа вернутая на паўторны разгляд у суд Маскоўскага раёну Брэсту.**

7 мая ў абласным судзе Брэсту адбыўся разгляд касацыйнай скаргі на рашэнне суду Маскоўскага раёну Брэсту аб прызнанні шэрагу публікацый у № 7–8 недзяржаўнага інтэлектуальнага часопіса «ARCHE» «экстрэмісцкімі матэрыяламі, якія падлягаюць знішчэнню». Перасуд быў прызначаны на 6 красавіка, але перанесены на 7 мая па ініцыятыве судовай калегіі па грамадзянскіх справах Брэсцкага абласнога суду.

Рэдактар часопісу «ARCHE» Валер Булгакаў, які прысутнічаў на працэсе, адзначыў, што суддзі карысталіся ў часе працэсу беларускай мовай. Судовая нарада доўжылася ўсяго 5 хвілінаў. Гэта можа азначаць, што рашэнне было перадвызначаным.

Нагадаем: 25 лютага суддзя Маскоўскага раёну Брэсту Тацццяна Міранюк задаволіла заяву ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці ад 30 снежня 2008 г. аб прызнанні выдання экстрэмісцкім. «...Праведзеным аналізам устаноўлена, што ў часопісах утрымліваюцца звесткі, якія дыскрэдытуюць дзейнасць органаў улады і кіравання Рэспублікі Беларусь, узмацняюць сацыяльна-палітычную напружанасць і супрацьстаянне ў грамадстве, стымулююць здзяйсненне дзеянняў, накіраваных на арганізацыю і ажыццяўленне масавых беспарадкаў, і тым самым ствараюць пагрозу бяспецы Рэспублікі Беларусь», — сцвярджалася ў заяве за подпісам начальніка УКДБ, палкоўніка Леаніда Дзядкова. Меліся на ўвазе артыкулы палітолагаў, прысвечаныя палітычнай сітуацыі ў Беларусі і выбарам 2008 году.

Слуханні тады праходзілі ў закрытым рэжыме і доўжыліся ўсяго адну гадзіну.

«ARCHE» — адно з апошніх беларускамоўных і адначасова адно з усяго некалькіх апазіцыйных да лукашэнкаўскіх выданняў, што захаваліся. Дзякуючы сваёй якасці, «ARCHE» — адзінае з беларускіх выданняў, далучанае да еўрапейскае сеткі інтэлектуальных часопісаў «Eurozine».

Рэдактар часопісу «ARCHE» задаволены рашэннем калегіі Брэсцкага абласнога суду. На ягоную думку, канчатковая перамога часопісу стала б важным прэцэдэнтам для абароны права на свабоду выказвання і меркавання.

У справе «ARCHE» запыт у беларускае МЗС дасылаў офіс упаўнаважанага па свабодзе СМІ пры АБСЕ.

**Мікола Бугай**

## ГАСПАДАРКА

# Даходы бюджэту знізіліся на 30%

**Іх недабор у першым квартале склаў 600 млрд рублёў, але Мінфін збалансаваў бюджэт, рэзкага скараціўшы выдаткі.**

У дзяржбюджэт за першы квартал надышло, у разліку паводле статнормаў МВФ, 9,89 трлн рублёў. За той жа перыяд мінулага году даходы складалі 10,49 трлн руб. Такім чынам, даходы знізіліся на 600 млрд руб. З улікам дэвальвацыі рубля, у пераліку на даляры даходы за гэты час упалі ажно на 30%.

Каб збалансаваць бюджэт, Мінфін пайшоў на значнае скарачэнне расходнае часткі да 8,9 трлн. руб. у першым квартале.

**МБ**

# Імпарт аўтамабіляў расце, нягледзячы на крызіс

Імпарт легкавых аўтамабіляў у Беларусь у першым квартале 2009 г. павялічыўся на 20,7% у параўнанні з аналагічным перыядам 2008 г. да 39 тыс. адзінак, у грашовым выражэнні імпарт вырас на 4,5% да 236,9 млн дал.

Асноўны аб'ём імпарту забяспечваюць фізічныя асобы. Яны ўвезлі ў студзені-красавіку 2009 г. 22 тыс. аўтамабіляў (+10%) на суму 127 млн дал. (+14%).

Юрыдычныя асобы павялічылі ўвоз аўтамабіляў у 1,38 разы да 17 тыс. шт., у грашовым выражэнні аб'ём вывазу знізіўся на 5,2% да 110 млн дал.

Імпарт юрасобамі ажыццяўляўся пераважна з Германіі — 5,9 тыс. шт. на суму 39,2 млн дал., Францыі — 4,5 тыс. шт. на суму 18,6 млн дал., Японіі — 1,2 тыс. адзінак на суму 11,7 млн дал.

**Прайм-ТАСС праз afn.by**

# Эканоміка яшчэ не дасягнула раўнавагі

Золатавалютныя рэзервы Беларусі, разлічаныя па стандартах МВФ, скараціліся ў красавіку на 390,4 млн даляраў (на 9,8%) і на 1 мая дасягнулі 3 млрд 564,8 млн даляраў ЗША. За 2008 г. ЗВР скараціліся на 1 млрд 121,1 млн даляраў, нягледзячы на першы транш расійскага крэдыту ў 1 млрд даляраў (лістапад), і крэдыту Венесуэлы ў 500 млн даляраў (снежань).

**БелаПАН**

# Сіліцкі: Само запрашэнне яшчэ нічога не значыць

Працяг са старонкі 3.

Пакуль галоўная практычная карысць для Беларусі менавіта ў гэтых новых магчымасцях «сацыялізацыі» ў еўрапейскіх інстытутах і каштоўнасцях для больш шырокага кола беларускага грамадства. Нарэшце, важна тое, што з'явілася пэўная інстытуцыянальная рамка, якая легітымізуе доўгатэрміновае ўцягванне самога ЕС у справы постсавецкіх краінаў.

**«НН»: Ці апраўдаюцца чаканні беларускіх уладаў ад удзелу ва «Усходнім партнёрстве»?**

**ВС**: Я не думаю, што ў беларускага кіраўніцтва ёсць нейкія вялікія надзеі на «Усходняе Партнёрства», што да атрымання новага фінансавання. Магчыма, ёсць чаканні нейкіх буйных праектаў у той жа энергетычнай галіне. Але і іх ажыццяўленне будзе вымагаць выканання пэўнага палітычнага мінімуму, на які Беларусь ісці так не хоча. Само партнёрства, аднак, ужо адыгрывае пэўную ролю ў гульні на тым жа ўсходнім фронце. Відавочна, пры інтэнсіфікацыі расійскага ціску на Мінск Лукашэнка будзе ўсё гучней апеляваць да ЕС.

**«НН»: Вы лічыце, што Лукашэнку варта было запрасіць у Прагу?**

**ВС**: Давайце ўдакладнім, што, насуперак інфармацыі ў прэсе, фармальнага персанальнага запрашэння Лукашэнкі ў Прагу ніколі не было. Аднак, гэтаму міфічнаму запрашэнню на саміт было нададзена столькі ўвагі, што яго зрабілі ледзьве не галоўным ньюсмэйкерам самога «Усходняга партнёрства»! Прычым, такім чынам і беларуская апазіцыя, і некаторыя еўрапейскія палітыкі, самі таго не жадаючы, набілі беларускаму лідэру цану да завоблачных вышыняў. Ніякага палітычнага трыумфу Лукашэнку ў Празе не было б, і Лукашэнка дакладна гэта адчуў. Наадварот, яго прыезд справакаваў бы пэўны паварот у саміце, зрабіў бы тэму правоў чалавека і дэмакратызацыі на ім дамінуючай. Вось менавіта гэтага — палітычнага дыялогу — беларуская ўлады стараюцца пазбегчы любымі метадамі. Нарэшце, запрашэнне было неабходным, каб зафіксаваць сам удзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве». Персанальна я б запрасіў Лукашэнку ў Прагу, каб даць паглядзець на прыгожы еўрапейскі горад і, магчыма, зразумець, што той хайтэк, якім беларускія ўлады збіраюцца нашпігаваць гістарычны цэнтр гораду, не варты яго. Але гэта, канечне, жарт.

**«НН»: BISS прапануе Еўропе прыняць Лукашэнку такім, які ён ёсць, чаму?**

**ВС**: Прыняць такім, які ёсць — такіх словаў у нашых дакументах вы не знойдзеце. Гэта недарэчная інтэрпрэтацыя нашай прапановы адным беларускім выданнем, яшчэ больш недарэчна перадрукаваная, без спасылак на першакрыніцы, іншым выданнем. Тое, што гэтае выданне вырашыла не ўзгадваць пра суаўтара прапановы — Офіс за дэмакратычную Беларусь — цягне на правакацыю. Пытанне, аднак, вось у чым. Мы сапраўды выступалі за тое, каб Беларусь была прынятая ва «Усходняе партнёрства» ўжо зараз, а не пасля выканання пэўных палітычных умоваў, як патрабавала частка палітычнай апазіцыі. Чаму? Ды таму, што «УП» — гэта не прыз, якім узнагароджваюць за добрыя паводзіны, а інструмент, праз які можна будзе прасоўваць змены. Тут і цяпер, а не ў казачныя часы, калі падзе крывавы рэжым і да ўлады прыйдуць АДС. Прасоўваць Беларусь праз уцягванне краіны ў еўрапейскія працэсы, перааryентацыю яе эканомікі, праз сацыялізацыю чынавенства, праз той жа палітычны дыялог, праз легітымізацыю ролі грамадзянскай супольнасці ва «УП».

**«НН»: А ці гатовая Еўропа прыняць такога Лукашэнку?**

**ВС**: Што да Еўропы, дык яна абсалютна нічога не губляе. Паўтаруся — удзел у праграме не азначае аўтаматычнага надання нейкіх даброт. Можна спаслацца на адсутнасць прагрэсу і блакаваць дамовы, фінансаванне. А вось пляцоўка для палітычных кантактаў застаецца.

**«НН»: Якое месца ў новых рэаліях зойме беларуская апазіцыя?**

**ВС**: Гэта яе выбар — заняць гэтае месца ці не. Супрацоўніцтва з Лукашэнкам зусім не азначае спынення кантактаў і падтрымкі дэмакратычных сілаў. Аднак гэтыя працэсы правакуюць і пэўнае перафарматаванне апазіцыі, і вось гэта прывяло яе лідэраў у стан шоку. Апаненты новага курсу ЕС да Беларусі, аднак, не здолелі зразумець, што «здрада» Еўропы — гэта перш за ўсё наступствы таго, што палітычная апазіцыя аказалася няздольнай прапанаваць альтэрнатыўнага сцэнару дэмакратызацыі Беларусі, дзеля якога варта было б падтрымліваць палітыку ізаляцыі. Дык што калі, па словах Івашкевіча, Лукашэнка — гэта крызіс, дык АДС — гэта дыялог. Крытэрам палітычнага поспеху ў апазіцыйным лагеры вельмі доўга было тое, з кім з еўрапейскіх палітыкаў сустракаецца той ці іншы лідэр апазіцыі. У такой сістэме каардынатаў кантакты ЕС з Лукашэнкам — гэта катастрофа для апазіцыі, але для каго мы мусім захоўваць гэтую сістэму каардынатаў? Для пары-тройкі партыйных лідэраў? Якая карысць ад гэтага Беларусі, дэмакратыі, газетам, грамадскім арганізацыям, тым жа палітвязням? Да таго ж, спробы «легчы пад цягнік» і спыніць працэс ангажавання Лукашэнкі ў ЕС скончыліся няўдачай і яшчэ большай маргіналізацыяй апазіцыі, прычым не толькі ў адносінах да ўладаў, але і да грамадзянскай супольнасці, якая збольшага выкарыстала свой шанец і здолела выпрацаваць хоць нейкія прапановы для Еўрасаюзу што да дыялогу і партнёрства, тыя самыя «шпаргалкі», якія вельмі не любіць Лукашэнка. Розуму не кідацца пад цягнік хапіла спярша Мілінкевічу, і, як гэта ні парадаксальна, нават Пазняк зразумеў раней за кіраўніцтва АДС, што агрызанне наконт «здрады» Еўропы бесперспектыўнае, і што трэба канкрэтныя прапановы. Дык вось месца ў новых рэаліях знойдуць тыя, хто здольны канцэнтравацца не на асобе, а на сутнасці размовы, прапанаваць парадак дня і рэальныя альтэрнатывы для тых працэсаў, якія разгортваюцца ў рамках «УП».

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Зянон Пазняк: Мы пайшлі на кампраміс

Лідэр Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ узяў на сябе ініцыятыву па выпрацоўцы адзінай заявы лідэраў апазіцыі з нагоды старту «Усходняга партнёрства».

Івонка Сурвілла, Аляксандр Казулін, Аляксандр Мілінкевіч, Зянон Пазняк і Станіслаў Шушкевіч склалі дэлегацыю незалежнага грамадства Беларусі на саміце «Усходняга партнёрства». Упершыню за доўгі час у яе ўвайшоў Пазняк, які доўга трымаўся асабняком на палітычным полі.

Такім «выбарам апазіцыі» Чэхія прадэманстравала сваё бачанне палітычнай дынамікі. Характэрна, што ніводзін лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, што аб'ядноўваюць разнародныя палітычныя партыі, ад ліберальных да русафільскіх, у Прагу запрошаны не быў.

Ініцыятарам перамоваў з удзелам Казуліна і Сурвіллы быў Зянон Пазняк, які ў свой час залічваў і Казуліна, і Мілінкевіча да «псеўдаапазіцыі».

Чаму Пазняк палічыў, што надышоў момант для супольнага дзеяння? Ён тлумачыць у інтэрв'ю радыё «Свабода»: «Ёсць інтарэсы Беларусі, якія павінны аб'ядноўваць усіх. Па асноўных пытаннях — культура, ацэнка «Усходняга партнёрства», ацэнка рэжыму, неабходнасць падключаць грамадзянскую супольнасць — дасягнутае поўнае разуменне. У нейкіх аспектах не ўдалося ўзяць адзін подпіс. Гэта не бяда, думаю, што ў будучыні будзе дасягнута больш паразумення».

Казулін, Пазняк, Сурвілла і Шушкевіч падпісалі зварот да Еўрасаюзу з нагоды старту «Партнёрства», Мілінкевіч адмовіўся.

«Калі грамадзянская супольнасць Беларусі не будзе ўключаная ў новую палітыку «Усходняе партнёрства» Еўрасаюзу, то гэтая праграма фактычна стане легітымацыяй рэжыму Лукашэнкі», — гаворыцца ў звароце.

Мілінкевіч жа мяркуе, што ўдзел Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства» трэба ў кожным разе вітаць, не абстаўляючы ніякімі ўмовамі, бо ўдзел, незалежна ад Лукашэнкі, выгадны Беларусі і паспрыяе яе еўрапейскай трансфармацыі.

**Барыс Тумар**

## Юшчанка Лукашэнку: Захавайце мову і культуру

Чатырохгадзінная сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Украіны ў Гомелі стала для Юшчанкі нагодай, каб акцэнтаваць нацыянальныя інтарэсы дзвюх нацыяў.

На перамовах у Гомелі, а пазней у выступе перад журналістамі прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка падкрэслена гаварыў па-ўкраінску. Аляксандр Лукашэнка адказваў па-расійску.

Віктар Юшчанка звярнуў увагу кіраўніка Беларусі на праблемы мовы і культуры і вось такім намёкам: «Мы абмяркоўвалі з Аляксандрам Рыгоравічам, што б мы маглі зрабіць у сферы адукацыі. Мы зачапілі пытанне, што ў 2009 годзе неабходна адкрыць кафедру беларускай мовы ў адным з універсітэтаў Украіны. А магчыма, і не ў адным. Гэтым мы хочам падкрэсліць, што мы з пашанай ставімся да жыцця беларускай грамады, якая хоча зберагчы сваю мову, сваю культуру і гісторыю», — цытуе яго радыё «Свабода».

## Параза Лукашэнкі

Далучэнне Беларусі да «Усходняга партнёрства» — гэта сімвалічная кропка ў планах будаўніцтва саюзу Беларусі і Расіі. Гэта канчатковая параза аўтарскага праекту Аляксандра Лукашэнкі — адбудовы савецкай імперыі.

«Для мяне Беларусь — ужо пройдзены этап», — неяк шчыра прызнаўся Аляксандр Рыгоравіч. Ён казаў, што «на каленях гатовы паўзці ў Расію». Потым у заліхвацкім угары разбіваў у Маскве келіх з шампанскім. Марыў пра Крэмль...І вось на гадзінніку год 2009-ы, і мы маем юрыдычны ўваход Беларусі ў канкурэнцыйны празаходні геапалітычны праект ды непрыхаванае падлашчванне Лукашэнкі да заходніх «вашывых блох» ў надзеі на інвестыцыі і крэдыты.

**Андрэй Пачобут, Arche.by.**

## ЦЫТАТЫ

### Міраслаў Гой: У будучыні нас чакае Еўрасаюз

Старшыня Смаргонскага райвыканкаму — у інтэрв'ю «Звяздзе»: «Вал малака і зерня мы выдаваць навучыліся, цяпер задача — канкурэнтаздольнасць. Трэба разумець, што ў будучыні нас чакае Еўрасаюз з якаснай і таннай прадукцыяй, і мы імкнёмся да гэтага».

### Наталля Пяткевіч пра самае галоўнае

Намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта **(на фота)**: «Наяўнасць шырокага асартыменту


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

прадуктаў і тавараў на паліцах у крамах — другаснае. Першараднае значэнне мае тое, што мы можам бачыць сонца, радавацца яму».

### Ад мамантаў спакон вякоў

Прэзідэнцкі геральдыст выводзіць арнамент на дзяржаўным сцягу ад мамантаў: «Рамбічны арнамент, які прысутнічае на дзяржаўным сцягу РБ, яскрава бачны пры зрэзе біўня мамaнта», — паведаміў доктар гістарычных навук, член Геральдычнае рады пры прэзідэнце Сяргей Рассадзін.

**«Звязда»**



Руслан Салей засмучаны.

# Усё хакей

**Беларусь гуляла на роўных з Расіяй у Швейцарыі і прыме чэмпіянат свету 2014 году.**

Сёлетні чэмпіянат свету па хакеі ў Швейцарыі нашым хлопцам удаўся. Зборная Беларусі выканала задачу — трапіла ў васьмёрку наймацнейшых. У чвэрцьфінале беларусы ў напружанай барацьбе прайгралі будучым чэмпіёнам свету — Расіі. Прычым, ніякай наканаванасці ў вачах беларускіх хакеістаў не было. Змагаліся да апошняй хвіліны. І лёс матчу вырашыла толькі персанальнае майстэрства расійскай зоркі Іллі Кавальчука — 3:4.

Тыдзень багаты і іншымі хакейнымі навінамі. 8 мая ў Берне было вырашана, што Беларусь прыме чэмпіянат свету ў 2014 г. Наша краіна перамагла з яўнай перавагай, узяўшы 75 галасоў. За Венгрыю прагаласавала 24, за Украіну і Латвію — па 3.

Праз пяць гадоў першынства свету пройдзе на арэнах у Вяснянцы і Чыжоўцы. Правы на правядзенне першынства нашай краіне даверылі з трэцяй спробы. Дагэтуль прайгравалі Германіі і Швецыі. Заяўлены бюджэт Чэмпіянату — $11,4 млн.

Але нават і гэтая перамога не стала для нас апошняй у Швейцарыі. Аргкамітэтам першынства і галасаваннем журналістаў беларускі хакеіст Андрэй Мезін прызнаны найлепшым брамнікам чэмпіянату. А на сайце міжнароднай федэрацыі хакею Мезін ідзе першым у галасаванні на званне найлепшага гульца ЧС-2009.

**Зміцер Панкавец**

### Зборная па костачках

Дарэчы, якім параметрам павінен адпавядаць ідэальны хакеіст? Сярэдні рост гульцоў зборнай Беларусі складае 183,5 см, а вага — 87,7 кг. Цікава, што якраз з такімі габарытамі гульцоў у зборнай падчас вырашальных матчаў і не было. Амаль цалкам адпавядаюць ім браты Сяргей (183 см, 89 кг.) і Андрэй (183 см, 91 кг) Касціцыны, што не прыехалі ў Швейцарыю.

Найвышэйшым у нашым складзе быў малады мінскі «дынамавец» Дзмітры Корабаў (191 см), найменшым — яго аднаклубнік Андрэй Антонаў (177 см). Характэрна, што абодва гэтыя абаронцы лічыліся «лішнімі» ў зборнай і не заўсёды траплялі ў асноўны склад. Як бачым, надта высокім і надта нізкім у хакеі гуляць не так і лёгка.

Найцяжэйшы ў камандзе — другі брамнік Віталь Коваль (100 кг), з палявых гульцоў — усё той жа Корабаў (98 кг). А самы мініяцюрны — нападнік мінскага «Кераміну» Яўген Кавыршын (77 кг). Ненашмат за яго цяжэйшыя, што таксама цікава, два брамнікі —Андрэй Мезін (78 кг) і Ігар Брыкун (78 кг).

Сярэдні ўзрост гульцоў нашай каманды складае 28 гадоў (узрост капітана Канстанціна Кальцова і Яраслава Чупрыса). Найстарэйшым хакеістам нацыянальнай зборнай быў форвард Алег Антоненка, 1 ліпеня яму спаўняецца 38 гадоў. Столькі ж у жніўні стукне Аляксандру Макрыцкаму, які ў Швейцарыі праз траўму змог правесці толькі адзін матч. Зрэшты, хакей — гэта не футбол. І 40-гадовым хакеістам нікога не здзівіш. У НХЛ па-ранейшаму на высокім узроўні за «Дэтройт» выступае 47-гадовы Крыс Чэліёс.

Наймаладзейшым у камандзе быў Дзмітры Корабаў, 1989 году нараджэння.

Сярод гульцоў зборнай пятнаццаць з'яўляюцца выхаванцамі мінскай хакейнай школы «Юнацтва». Яна ад савецкіх часоў да сёння — галоўная кузня кадраў для айчыннага хакею. Трое прадстаўлялі наваполацкую школу (прагульшчыкі Касціцыны — таксама яе выхаванцы). Нягледзячы на актыўнае будаўніцтва лядовых палацаў, у краіне фактычна існуюць толькі дзве гэтыя хакейныя школы. Магчыма, хутка падцягнецца гомельская.

Яшчэ восем хакеістаў спасцігалі азы гульні ў Расіі (Мезін, Коваль, Усенка, Антонаў, Кавыршын, Уграў, Бараўкоў, Дземагін). Да прыкладу, у латышоў, якія таксама трапілі ў васьмёрку, легіянераў не было ўвогуле, усе свае. Зрэшты, той жа Андрэй Мезін за апошнія адзінаццаць гадоў толькі аднойчы не адгукнуўся на выклік з нацыянальнай каманды — летась. Гэты ўраджэнец Чалябінску ўжо настолькі беларусізаваўся, што перад чвэрцьфіналам абяцаў, што наша каманда разліе перад Расіяй беларускае балота, а калі трэба будзе, то і падпаліць яго.

Беларускія хакеісты Руслан Салей і Міхаіл Грабоўскі занялі сярод усіх гульцоў чэмпіянату першае і другое месца па колькасці часу, праведзенага на пляцоўцы. Салей гуляў блізу 29 (!) хвілінаў чыстага часу. Нават у сваім «Каларада Эвеланш», дзе беларус таксама гуляе больш за астатніх, ён праводзіць на пляцоўцы не больш за 21 хвіліну. Грабоўскі гуляў каля 26 хвілінаў, што таксама выглядае проста фантастычна. Асабліва, калі параўноўваць з 16 у «Таронта». Мужыкі выкладаліся на поўную сілу. Але, разам з тым, такія паказчыкі сведчаць, што стаўка ў зборнай рабілася на невялікую колькасць гульцоў.

# Эдуард Занкавец: Не засталося негатыву

**Пра вынікі чэмпіянату свету карэспандэнт «НН» пагутарыў з другім трэнерам зборнай Эдуардам Занкаўцом.**



Маглі б і лепей. Заўзятары ў часе матчу Беларусь–Расія перад экранам каля Палацу спорту.

**«Наша Ніва»: Якія ў Вас уражанні ад сёлетняга першынства?**

**Эдуард Занкавец**: Станоўчыя, добрыя. Не засталося абсалютна ніякага негатыву.

**«НН»: Месца ў васьмёрцы – гэта столь для зборнай, ці ёсць куды расці?**

**ЭЗ**: Безумоўна, ёсць. Нават на гэтым чэмпіянаце мы маглі быць вышэй, каб спрыяла фартуна. Не хапіла крышачку шанцавання ў матчы з Расіяй.

**«НН»: Ці можна казаць, што Беларусь сфарміравалася як хакейная дзяржава?**

**ЭЗ**: Натуральна. Для хакею ў краіне робіцца вельмі шмат. І гэта дае вынікі. Магчыма, мы яшчэ не з'яўляемся лідэрамі сусветнага хакею, але тэндэнцыя абнадзейвае.

**«НН»: Беларусь здольная якасна правесці чэмпіянат свету 2014 году?**

**ЭЗ**: Без усялякіх сумневаў. Магу запэўніць, што першынства пройдзе на самым высокім узроўні. І гэты чэмпіянат увойдзе ў гісторыю як адзін з найлепшых.

**«НН»: А што для Вас асабіста значыць правядзенне першынства ў Мінску?**

**ЭЗ**: Усе мае сваякі і сябры атрымаюць магчымасць паглядзець матчы зорак сусветнага хакею! Перакананы, беларусы ў пачэснай камандзе не згубяцца і парадуюць балельшчыкаў добрай гульнёй.

**«НН»: Дарэчы, у беларускіх СМІ было шмат нараканняў адносна ўмоваў у Швейцарыі. Былі нейкі дыскамфорт?**

**ЭЗ**: Не ведаю, хто гэта прыдумаў. Чэмпіянат арганізаваны быў добра. Ніякіх скаргаў адносна бытавых умоваў ці нейкіх хакейных момантаў у мяне няма.

**«НН»: Што трэба зрабіць, каб Беларусь не проста трапляла ў плэй-оф, але і змагалася за медалі?**

**ЭЗ**: Яно робіцца. Выступленне мінскага «Дынама» ў чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі спрыяе. Гульцы непазбежна прагрэсуюць у такой моцнай лізе. І чым болей беларусаў будзе ў складзе камандаў КХЛ, тым лепей для зборнай. Было б добра, каб і яшчэ адна беларуская каманда змагла гуляць у Кантынентальнай лізе. Пытанне толькі ў тым, наколькі нам хопіць сродкаў на гэта.

Станоўчы факт, што і наш найлепшы клуб, і зборную ў наступным сезоне будзе ўзначальваць адзін спецыяліст — Глен Хэнлан.

**«НН»: Хто, на Ваш погляд, быў найлепшым у складзе зборнай у Швейцарыі?**

**ЭЗ**: Андрэй Мезін. Ён цалкам заслужыў званне найлепшага брамніка першынства.

**Гутарыў ЗП**

## НАВІНЫ СЦІСЛА

### Беларуская мова папулярная

У першы дзень, 4 мая, на цэнтралізаванае тэсціраванне ў Гродзенскай вобласці зарэгістраваўся 1231 чалавек. Самыя папулярныя прадметы — матэматыка і беларуская мова.

### Бел-чырвона-белыя сцягі на канцэрце «Ляпісаў»

На канцэрце «Ляпіса Трубяцкога» 7 мая ў Магілёве, калі музыкі сталі спяваць «Freedom Belarus», моладзь падняла бел-чырвона-белыя сцягі. У адрозненне ад Мінску, дзе міліцыя рэагавала спакойна, у зале клубу «Ліга», дзе адбываўся канцэрт, затрымлівалі. Як сцяганосьбітаў, так і тых, у каго на вопратцы ці заплечніках была нацыянальная сімволіка: сцяжочкі і герб «Пагоня». Усяго было затрымана каля 20 чалавек. Вядомае імя аднаго з іх — Станіслаў Сенакосаў. Ён адным з першых падняў нацыянальны сцяг.

### Беларус балатуецца ў Еўрапарламент

Гэта прафесар Антон Мірановіч — кіраўнік кафедры гісторыі культураў пагранічча ў Інстытуце гісторыі Беластоцкага універсітэту. Ён беспартыйны, але будзе кандыдаваць ад ліберальнае партыі Грамадзянская платформа. Антону Мірановічу сёлета споўніцца 50 гадоў. Ён нарадзіўся 30 кастрычніка 1959 г. у Беластоку. Працаваў настаўнікам у школе, супрацоўнічаў з газетамі «Ніва» і «Przegląd Prawosławny». З 1986 г. — выкладчык Інстытуту гісторыі Варшаўскага універсітэту, пасля — Інстытуту гісторыі універсітэту ў Беластоку. Напісаў некалькі кніг па гісторыі Падляшша.

**МБ; «Вечерний Гродно», «Ніва», радыё «Свабода»**

# Дачка камбрыга Бумажкова — Лукашэнку: Вы ведзяце псіхалагічную вайну супраць свайго народу

**Таццяна Бумажкова** выступіла з адкрытым лістом да кіраўніка ўлады, у якім узнімае як асабістыя пытанні, так і выкрывае палітыку фальсіфікацыі гісторыі і праслаўлення сталінізму.

### Цытаты з ліста

«Мой тата — Макар Піменавіч Бумажкоў, знакаміты ў гады вайны партызанскі камбрыг, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў беларускага партызанскага руху як народнага супраціву. Менавіта — народнага супраціву, таму што партызанскі рух не быў аднародным, у ім існавалі і спецыфічныя дыверсійныя, карныя плыні, кіраваныя непасрэдна з Масквы такімі спецыялістамі, як заслужаны кілер Савецкага Саюзу генерал НКВД Павел Судаплатаў, і ваенныя аперацыі такога кшталту «партызанаў» неслі, як правіла, свядома разлічаныя гібельныя наступствы для мясцовага насельніцтва».

...

«Наўрад ці патрэбныя дадатковыя тлумачэнні рашэнню нашай сям'і апусцелы дом таты не прадаваць, а захаваць як памяць. ... Мы не прасілі дапамогі ў дзяржавы, зрабілі капітальны рамонт ... Летам 2005 г., у год 60-годдзя Перамогі, я прыехала ў Капыль, каб скончыць вонкавае аздабленне дому і ўсталяваць памятную шыльду.

Дом быў спустошаны. У лютыя маразы капыльскі ЖКГ (дырэктар Карэеў Г.А.) абрэзаў цепласетку, не паруліўшыся зліць ваду з батарэяў ацяплення. «Рамонт» дарогі пабач даканчыў разгром».

Куды я толькі ні звярталася, усюды мяне адфутбольвалі, наракае Т.Бумажкова. Адбываецца, піша яна, «ізаляцыя кіруючай вярхоўкі ад ... масы».

«Цынізму яны навучыліся ў Вас, сп. Прэзідэнт.

Яшчэ на другім годзе свайго кіравання Вы выступілі па беларускім радыё з прамовай, якая абразіла ўвесь беларускі народ. Вы ўсхвалялі Гітлера як узор дзяржаўнага дзеяча за яго ныя невымерныя поспехі ў пад'ёме эканомікі Германіі». ...

«Наступная Ваша заява — пра недастатковасць беларускай мовы для выражэння ўсёй глыбіні Вашых думак і што толькі расійская мова і, вы дапускалі, англійская адпавядалі інтэлектуальнаму зместу Вашай натуры — уразіла беларусаў як нацыю. Менавіта за гады Вашага кіравання выкарыстанне беларускай мовы звезденае да ўзроўню, калі беларускія вядучыя на Беларускім тэлебачанні не ў стане падтрымаць размовы на роднай мове з часам узнікаючым у шоу беларускім грамадзянінам».

«А Вашы неаднаразовыя выхвальныя прызнанні ў тым, якімі каштоўнымі аналітычнымі матэрыяламі забяспечваюць Вас расійскія спецслужбы! ... Калі Вы, сп. Прэзідэнт, у дзяржаўнай дзейнасці зыходзіце з матэрыялаў спецслужбаў іншай дзяржавы, то хто насамрэч накіроўвае ўнутраную і замежную палітыку нашай краіны і ў чыіх інтарэсах?

Любое з гэтых прыведзеных выказванняў каштавала б кіраўніку любой дэмакратычнай краіны і дзяржаўнай пасады, і палітычнай кар'еры. Але Вы, сп. Прэзідэнт, лічыце маральна зручным для сябе і далей казаць «ад імя беларускага народу»...»

«У Беларусі доўгія гады ідзе псіхалагічная вайна супраць уласнага насельніцтва — у традыцыях Савецкага Саюзу, з тым жа галоўным складнікам — дэзінфармацыяй. Найперш гэта тычыцца гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе непарушнасць савецкай міфалогіі, відавочна, уяўляецца Вашаму атачэнню гарантам поспеху ў апрацоўцы масавай свядомасці людзей.

Фальсіфікацыя падзеяў вайны дайшла да грубай містыфікацыі. Ініцыятарам першага адкрытага ашуканства краіны ў выглядзе нагляднай агітацыі «аднаўленне «Лініі Сталіна» стаў Ваш бліжэйшы паплечнік Шэйман. ... На макеціку ўжо прыладзілі бюсцік Сталіна і завялі ... рытуал ... са згадваннем ... невядома якіх зацятых баёў». Відаць, у Вашым атачэнні няма каму параўнаць простыя лічбы: 22 чэрвеня пачалася вайна, 26 чэрвеня з поўначы ў Мінск увайшлі танкі Гота, 27 чэрвеня з захаду — танкі Гудэрыяна...

Сталін з наркамам абароны Цімашэнкам і начальнікам Генштабу Жукавым нясуць наўпростую адказнасць за небывалы ў гісторыі разгром войска, якое па ўсіх параметрах шматкроць пераўзыходзіла сілы суперніка, і з'яўляюцца галоўнымі вінаватымі ў вале бедстваў, пакутаў і гора, што абрынуліся на Беларусь. Іх імёны не могуць праслаўляцца на нашай зямлі».

«А «...мемарыял «абаронцаў Брэсцкай крэпасці» ... увайшоў у беларускую міфалогію з 1960-х гадоў.

Вас, сп. Прэзідэнт, ніколі не цікавіла, чаму ў гады Вашага школьнага дзяцінства ўсім убівалі ў галаву легенду пра адзінага выратаванага з усіх абаронцаў Брэсцкай крэпасці хлопчыка-гарніста Пецю Клыпу, а з сярэдзіны 1990-х гадоў наведваць Беларусь пачалі ўсё новыя і новыя абаронцы крэпасці, якія да гэтага часу настойліва не адгукаліся?

Іх сціпласць звязаная з датай 14 чэрвеня 1941 году. У гэты дзень уздоўж заходняй мяжы СССР была праведзеная «зачыстка» тэрыторыі ад «ворагаў народу». Сем'і з дзецьмі, старымі хапалі, у чым былі, набівалі плачучымі людзьмі вагоны для скацыны загадзя падагнаных эшалонаў і ... накіроўвалі ў раёны Запаляр'я. ... У Брэсцкай крэпасці вайну сустрэлі Осназ і іншыя фармаванні НКВД, што ўдзельнічалі ў карнай аперацыі. У прыватнасці, каля Тэрэспальскіх варотаў, дзе год таму так рамантычна, з запаленымі свечкамі, славілі «абаронцаў крэпасці», знаходзіўся 132 канвойны батальён НКВД і 17-ы полк НКВД. ... Цяжка сказаць, з кім болей яны баяліся сустрэцца: з гітлераўцамі альбо з тымі мясцовымі жыхарамі, якія цудам пазбегнулі «зачысткі».

...

Вайна Вашага атачэння супраць гісторыі і памяці беларускага народу дайшла да здрады нацыянальных інтарэсаў. У гэтым шэрагу не толькі такія «прарывы», як ваенны саюз з Масквой, які ізноў паставіў Беларусь у становішча буферу ўсё з тымі ж гібельнымі наступствамі для беларусаў. У гэтым шэрагу і працяг нахабнай дэзінфармацыі, і ... ганьбаванні магілаў ахвяраў дзяржаўнага тэрору ў Курапатах, і ... здзекі з памяці майго таты, храбрага партызанскага камбрыга...»

**Таццяна Бумажкова, Charter97.org**


Юлія Дарашкевіч

# Таццяна Бумажкова: Я зразумела

З Таццянай Бумажковай гутарыць **Наталка Бабіна**.

**Таццяна Бумажкова:** Памяць пра бацьку для мяне святая. А тое, што адбылося з ягоным домам у Капылі — гэта абраза яго памяці. Пры тым праслаўляецца памяць такіх энкавэдзістаў, як Ваўпшасаў, Шмыроў.

**Наталка Бабіна: Няўжо Вы думаеце, што Ваша крытыка дапаможа вырашыць пытанне з домам, які разбураецца з-за чыноўніцкай халатнасці?**

**ТБ:** Я напісала адкрыты ліст якраз тады, калі зразумела, што не дапаможа. І напісала ў канцы: прынамсі цяпер Лукашэнка не скажа, што ён «не ведаў». Тое, што адбываецца ў краіне — жахліва. Калі за мяжой кажаш, што ты з Беларусі, то першая рэакцыя: «А, кантрабанда зброі!» Краіна мае такую рэпутацыю!

**НБ: Вашы погляды так радыкальна памяняліся. Вас памятаюць як аўтара артыкулаў, у якіх на пачатку 1990-х Вы бескампрамісна выказваліся супраць дэмакратыі і незалежнасці («Бар'еры палітычнай слепаты»), памятаюць Вас як рэдактара газеты «Славянские Ведомости»...**

**ТБ:** Я ніколі не выступала супраць дэмакратыі і незалежнасці. Я папярэджвала пра тое, што тагачасныя метады БНФ могуць прывесці да крывавых падзеяў. Думаю, калі б я сёння сустрэлася з Быкавым, мы з ім зразумелі б адно аднаго... Тады я бачыла ў яго ўчынках расхістванне сістэмы. Тады мне здавалася гэта недапушчальным... Мне здавалася, што яны вядуць да сутыкнення людзей ілбамі, жадаюць крыві. Памылка дзеячоў адраджэння была ў тым, што яны мала пісалі, мала прапагандавалі свае погляды, не адказвалі ярка і запамінальна.

У пачатку 1990-х я з камсамольскім імпэтам стала выдаваць газету «Славянские Ведомости». Але хутка сама ж яе і зачыніла. Бо калі пайшла інфармацыя, раней закрытая, у мяне валасы ўсталі дыба! Мы ж былі ўпэўненыя, што савецкая ўлада маральная. Так, ёсць асобныя недахопы, але ў цэлым гэта справядлівы лад. І тут я зразумела, што гэта не так. Ілгаць чытачам не хацела. Балюча было разумець, што наўмысна цябе зрабілі сляпым, дурным...

> Мы ж былі ўпэўненыя, што савецкая ўлада маральная!

А ўвогуле, я заўсёды пісала так, як бачыла, як ведала. Працуючы ў «Сельской газете», я першай напісала, што праўду пра Чарнобыль ад нас хаваюць. Я пісала пра гучную «норкавую справу» — а за гэту тэму баяліся браца журналісты.

**НБ: Якіх дзеянняў Вы зараз чакаеце ад улады?**

**ТБ:** Я хацела паказаць людзям: гэты выпадак стаіць у шэрагу іншых такіх самых, калі людзей абражаюць беспакарана, калі крадуць ад нізу да верху, ад нізу да верху ілгуць. Калі б людзі ведалі, чым пагражаюць Беларусі саюзы з Расіяй, хіба яны дазволілі б уступаць у іх? Калі б была свабода інфармацыі, людзі б задавалі ўладзе вельмі непрыемныя пытанні. У кожнага чалавека ёсць натуральнае пачуццё справядлівасці, якое ўлада спрабуе заглушыць. Я буду працягваць задаваць пытанні.

Я мару стварыць грамадскі рух, які б займаўся менавіта тым, каб дапамагаць людзям аднаўляць сваю годнасць, якая ва ўмовах нашай краіны топчацца пастаянна — прычым на грошы налогаплацельшчыкаў, грамадзянаў. У якой яшчэ краіне свету магчыма, каб паліцэйскі ўдарыў кулаком па твары жанчыну і застаўся пры пасадзе, як гэта дабылося, калі амапавец ударыў Святлану Завадскую? Гэта ж жах!

Я патрабую толькі таго, што ў любой краіне з'яўляецца нормай. Я жыла і працавала за межамі Беларусі, але цяпер вярнулася спецыяльна для таго, каб давесці да канца справу з бацькавым домам і таптаннем ягонай памяці.

# Чалавек-невідзімка

Пра **Сяргея Ткачова** ў серыі «Палітбюро–2009» піша **Аляксандр Фядута**.




**Сяргей Ткачоў (першы злева ў чацвёртым шэрагу) не гоніцца за публічнасцю. Фота з тэлеэкрану, падчас звароту А.Лукашэнкі да народу і парламенту. У першым шэрагу — віцэ-прэм'ер Віктар Бура. У другім шэрагу — сілавікі: кіраўнік Службы аховы прэзідэнта Андрэй Уцюрын і памочнік прэзідэнта па бяспецы Віктар Лукашэнка. У трэцім шэрагу — міністр эканомікі Мікалай Зайчанка і міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў. Далей шэраг памочнікаў прэзідэнта. Поруч з Ткачовым — кіраўнік ідэалагічнага ўпраўлення Усевалад Янчэўскі. У пятым шэрагу справа невядомая жанчына, якая апошнім часам часта суправаджае кіраўніка дзяржавы.**

Ніводны з прадстаўнікоў бліжэйшага атачэння Аляксандра Лукашэнкі не можа параўнацца па ступені — і галоўнае, па глыбіні свайго ўплыву на будучыню краіны з чалавекам, пра існаванне якога не ведае амаль ніхто з «простых людзей». Але калі вы хочаце ўбачыць, як скаланецца любы прафесійны эканаміст, як праліе скупую мужчынскую слязу мільянер — вы назавіце гэтае імя. Калі вы супаставіце падрыхтаваныя гэтым чалавекам паперы з графікам акцыяў дробных прадпрымальнікаў-рыначнікаў, вы, паважаны чытач, зразумееце: гэты чалавек, нібы хобіт, які знайшоў кольца ўсяўладдзя і здолеў скарыстацца ім напоўніцу, паводле сваіх тэарэтычных уяўленняў пра эканамічнае дабро і зло.

Гаворка пра Сяргея Ткачова.

### Кампартыяй мабілізаваны і пакліканы

Аднагодак Аляксандра Лукашэнкі (абодва нарадзіліся ў 1954 г.), Сяргей Ткачоў пачынаў сваю кар'еру ў савецкай Беларусі. Выпускнік Беларускага тэхналагічнага інстытуту імя Кірава (скончыў у 1976 г.), Сяргей Паўлавіч пачаў працаваць на вытворчасці як майстар, інжынер-тэхнолаг, начальнік цэху заводу «Тэрмапласт». У 1985 годзе — «гарбачоўскі заклік» moладзі — перспектыктыўны работнік вытворчасці трапляе на пасаду інструктара, а потым намесніка загадчыка аддзелу агітацыі і прапаганды мінскага гаркаму КПБ.

Яго палічылі перспектыўным настолькі, што прапанавалі працягнуць адукацыю. У 1989 г. Ткачоў паступае ў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Верагодна, кар'еру ён працягнуў бы і далей па партыйнай лініі і дасягнуў бы ступеняў вядомых — невыпадкова Ткачоў паралельна вучыўся і ў аналагічнай установе пры ЦК Кампартыі Балгарыі. Але менавіта ў 1991 годзе, калі Сяргей Паўлавіч атрымаў балгарскі дыплом і рыхтаваўся праз год атрымаць дыплом савецкі, абедзве кампартыі далі дуба. А Ткачоў быў малады і нічога такога даваць не збіраўся. Таму, атрымаўшы ў 1992 г. дыплом ужо Расійскай акадэміі кіравання (цяпер гэтая шматкроць перайменаваная структура называецца Расійскай акадэміяй дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце РФ), ён вярнуўся ў родны Мінск і падрыхтаваўся да сумленнага выканання сваіх абавязкаў.

Але — дзе?

Вярнуўся дадому спадар Сяргей яшчэ і скончаным кандыдатам эканамічных навук. Тэма яго навуковай працы была вельмі актуальнай: «Малыя гаспадарчыя формы ў перыяд пераходу да рынку». Партыі ўсё адно не было, таму працэй за ўсё было ўладкавацца ў роднае ведамства — у Дзяржэканомплан Рэспублікі Беларусь. Узначальваў гэтую салідную структуру Сяргей Лінг, ветэран партыйнагаспадарчых нарадаў. Адрэкамендаваць Лінгу Ткачова мог Міхаіл Мясніковіч, з якім Сяргей Ткачоў працаваў у сталічным гаркаме партыі.

### Работнік з ініцыятывай

На розных пасадах у галоўным эканамічным ведамстве Беларусі Сяргей Ткачоў служыў да 2001 г. На апошнім этапе нават намеснікам міністра паспеў пабыць (з 1997 г.). Быў ён усім добры. Недахоп быў адзін — чалавекам ён быў ініцыятыўным.

— Чаму ж гэта недахоп? — абурыцца шаноўны чытач. — Гэта, хутчэй, якасць. Але як сказаў адзін з персанажаў булгакаўскага «Бегу», ініцыятыва, як і смеласць, робіцца добрай якасцю, калі чалавек, якому яна ўласцівая, змагаецца па адзін бок фронту з табой. А калі ён на іншым баку — робіцца недахопам. Вось намеснік міністра эканомікі Ткачоў выявіўся настолькі ініцыятыўным, што Міністэрства аж крыкам крычала і марыла, каб яго падвысілі. Бо ініцыятыву вылучаў ён, а рэалізоўваць яе даводзілася ўсім. І адказваць — усім. Уключна з міністрам.

Таму — як кажа легенда з нетраў Мінэканомікі, — калі Аляксандру Лукашэнку ў 2001 г. спатрэбіўся асобны памочнік па пытаннях эканомікі, міністр Уладзімір Шымаў з палёгкай скарыстаўся гэтай магчымасцю і адрэкамендаваў свайго звышініцыятыўнага намесніка — з надзеяй, што цяпер тузання будзе значна меней.

Ды дзе там!

### Рэха таемных думак

Быў такі Уладзімір Замяталін.

Хаця, спытае чытач, чаму быў? Ён жа ёсць! Працуе дырэктарам «Беларусьфільму».

Быў — бо ў Адміністрацыі ён быў. Асэнсоўваючы яго дзейнасць на пасадзе галоўнага ідэолага краіны, я сфармуляваў для сябе тэорыю чынавенскай «праводнасці». Звычайны чыноўнік ведае: у любы момант начальства спіша на яго адказнасць за ўласныя памылкі. Таму, калі ты разумееш, што начальства робіць памылку і ў памылцы настойлівае, галоўнае — не выканаць указанне да канца. Тады спытаць не будзе за што. Выканалі загад? Выконваем-с! А чаму выканалі, калі ён няслушны? Дык не да канца-с!

Вось такія чыноўнікі — «паўправаднікі». А Уладзімір Замяталін быў «ідэальным праваднíком», «звышправадніком», ды яшчэ і з «эфектам рэзанацыі». Лукашэнка толькі думаў — а Замяталін ужо выконваў, Лукашэнка рыхтаваўся, а ў Замяталіна ўсё ўжо на мазі было. Ён адгадваў патаемныя жаданні кіраўніка беларускай дзяржавы і рэалізоўваў іх на практыцы. Так, калі памятаеце, аднойчы была адключаная трансляцыя параду Перамогі з Масквы, а журналістам патлумачылі проста: «Рэспубліка Беларусь рэалізуе такім чынам прынцып дзяржаўнага суверэнітэту». І гэта быў першы кукіш Расіі — няхай нават трансляцыю і давялося потым узнавіць.

Але памочніка прэзідэнта Ткачова ў гэтай катэгорыі характарызаваць цяжка. Бо ён не мае ўласна адміністратыўных паўнамоцтваў, якія меў начальнік ідэалагічнага ўпраўлення, а затым намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Замяталін. Яму не трэба нічога рэалізоўваць на практыцы. Ён толькі паперкі піша.

Але паперкі таксама можна пісаць па-рознаму. Можна сыходзіць з добрых пажаданняў беларускай эканомікі, якую масціты эканаміст Сяргей Ткачоў, канечне, ведае. Але эканоміка эканомікай. Ткачоў жа памочнікам не ў эканомікі працуе, а ў кіраўніка дзяржавы. Яму і трэба дапамагаць адэкватна фармуляваць думку, трансфармуючы яе ў рэзалюцыі, прамовы, аналітычныя нататкі і г.д. Стаўленне ж кіраўніка дзяржавы да эканамічнай праблематыкі вядомае: будзе так, як ён скажа!

І ўсё, што кажа і выдае Лукашэнка ў якасці галоўнапраўляючага беларускай эканамічнай мадэллю, менавіта і рыхтуе Сяргей Ткачоў...

Здагадаліся, паважаны чытач? Вось калі выходзяць на плошчу дробныя прадпрымальнікі, пакажыце ім на ўсялякі выпадак фотаздымак Сяргея Ткачова буйным планам. Каб ведалі, каму менавіта яны мусяць дзякаваць.

Калі ўчора кіраўнік дзяржавы абвяшчае прыватызацыю, а заўтра (як у сакавіку 2004 году) падпісвае ўказ аб пашырэнні прававыкарыстання прынцыпу «залатой акцыі», пакажыце фотаздымак Сяргея Ткачова замежнаму інвестару. Каб, ізноў жа, ведаў, каму ён абавязаны гэтым шчасцем, што абрынулася на галаву.

І так можна працягваць да бясконцасці.

Добра абазнаны ў эканамічных поглядах свайго патрона, Сяргей Ткачоў прадбачыць наступны крок і рыхтуе той варыянт неабходнага дакументу, які і будзе прыняты як адзіна правільны. Як гэта назваць? «Эхалотам»? Але тады ўсё эканамічнае жыццё Беларусі ператвараецца з ягонай падачы ў «эхалататрон».

### Памылка прафесара Шымава

У Міністэрстве эканомікі многія пашкадавалі пра неабачлівасць, з якой прафесар Шымаў спіхнуў свайго бравага намесніка ў Адміністрацыю прэзідэнта. Бо рыхтаваў усе антырынкавыя паперы Ткачоў, а рэалізоўваць іх даводзілася яго былым калегам па ведамству. І адказваць за падзенне інвестыцыяў, выкліканае, у тым ліку, і рэалізацыяй гэтых папераў.

За што адказвае Ткачоў на пасадзе памочніка прэзідэнта? За паперу. Яна павінна быць падрыхтаваная пісьменна, пераканаўча, даступна. І толькі. Бо за ідэйную скіраванасць гэтай паперы адказвае толькі і толькі Аляксандр Лукашэнка.

Але ж пры іншых памочніках «па эканоміцы» той самы прэзідэнт яшчэ неяк змудраўся часамі і пад рыначніка «касіць». Так, прававедваў «сацыялістычны рынак» — але рынкі рэчавыя і прадуктовыя пры гэтым не скарачалі колькасці працоўных месцаў. Так, патрабаваў імпартазамяшчэння — але нават імпартазамяшчэнне выглядала хоць неяк абгрунтаваным і адносна разумным, нагадвала, хутчэй, чарговую прапагандысцкую кампанію, чым кампанію арганізацыйна-эканамічную. А цяпер...

Мой выкладчык гісторыі філасофіі прафесар Розенфельд казаў неяк:

— Самае страшнае — гэта наступствы памылкі светапогляду.

Беларуская эканоміка расхлёбвае наступствы памылкі светапогляду прафесара Шымава, які, мне здаецца, быў перакананы, што галоўнае — перасунуць няўручную фігуру падалей, а там хоць трава не расці. Кожны раз, калі сыходзіць у адстаўку чарговы кіраўнік чарговага міністэрства, палова чыноўніцкага апарату, вымушаная займацца непасрэднай рэалізацыяй паперау, што выходзяць з-пад пяра нястомнага Сяргея Ткачова, марыць, каб яго прызначылі міністрам хоць чаго-небудзь. Можна — эканомікі. Можна — спорту і турызму. Ён усяму дасць рады. Але толькі, каб ён адказваў за наступствы сваіх тэкстаў.

### Ён яшчэ застудзіцца на нашых пахаваннях!

Але сам спадар Сяргей не надта амбітны. Ён не хоча быць міністрам (хоць, паводле нашых звестак, прапаноўвалася яму і гэта). Яго задавальняе цяперашняе статус-кво. Такая грымучая сумесь з уэлсаўскага «чалавеканевідзімкі» і злога духа з «Шахнамэ» Фірдаўсі. Памятаеце?

«Я тут і не тут. Я ўсюды — і нідзе.»

Мы ўсе жывем паводле эканамічных законаў, прыдуманых Ткачовым, напісаных Ткачовым, санкцыянаваных Ткачовым. Мы — закладнікі адпаліраванай ім да бляску лукашэнкаўскай эканамічнай мадэлі.

Навошта Ткачову выходзіць з ценю? Уплыў яго і так аграмадны, магчымасці шырокія. А ў твар ніхто не ведае.

Але, з іншага боку, навошта чыноўніку, наогул, імя і прозвішча? У Бібліі сказана: «Па пладах іхніх пазнаеце іх...»

**Аляксандр Фядута, спецыяльна для «НН»**

# Абельская выедзе з Беларусі?

«Не выключана, што ў бліжэйшай будучыні кандыдат медыцынскіх навук Ірына Сцяпанаўна Абельская можа з’ехаць у Юрмалу», — піша «Белорусский партизан». Мяркуецца, што там яна зойме пасаду галоўнага доктара санаторыю «Беларусь» (Юрмала), які належыць Кіраўніцтву справаў прэзідэнта.

Пакуль галоўным лекарам санаторыю «Беларусь» у Юрмале працуе Алена Канстанцінаўна Лапатка. Яна займае гэтую пасаду з 22 лістапада 2005 году.

Чуткі пра тое, што неўзабаве Лапатку зменіць Абельская, ходзяць і ў самім санаторыі. Аднак ад любых каментароў на гэтую тэму афіцыйныя асобы курортнай установы катэгарычна адмаўляюцца.

**Паводле belaruspartisan.org**

# ДАІ: за бел-чырвона-белыя стужкі не штрафуюць, як і за георгіеўскія

Як і ў апошнія гады, перад 9 Траўня на вуліцах пачалі з’яўляцца аўтамабілі з прымацаванай да антэны георгіеўскай стужачкай. Не дзіва, мяркуючы па размаху штогадовага святкавання, але дзіўна, улічваючы, што ДАІ не вітае дадатковыя ўпрыгожванні (кшталту налепак) на машынах. Але ці не пагражаюць штрафы за жоўта-чорную ініцыятыву? Карэспандэнт «НН» звярнуўся за каментаром у прэс-службу Дзяржаўтаінспекцыі.

— Вядома ж, не! Гэта дзяржаўнае свята, нават патрульныя машыны ўпрыгожаныя такімі стужачкамі.

— Ці магу я прымацаваць сабе на аўто такую ж, толькі бел-чырвона-белую?

— Я не магу пракаментаваць гэта (смяецца). Вы ж зразумейце, што георгіеўскія стужкі — гэта ініцыятыва людзей. У іх свята, радасць перамогі. Калі вы не прымаеце гэта свята, проста не чапляйце стужку.

— Дык калі я адзначаю сваё свята, бел-чырвона-белае, мяне не аштрафуюць?

— Калі на стужцы няма рэкламы — не.

**Ягор Марціновіч**


ЮЛІЯ РУЖАЧКА

# Дзмітрый Лукашэнка на «Мотаршоу»

На адкрыцці «Мотаршоу» ў футбольным манежы пабываў і сярэдні сын беларускага кіраўніка Дзмітрый Лукашэнка. Адпачываў ад сваёй цяжкай працы — ён узначальвае Прэзідэнцкі спартовы клуб.

# Сяргей Крывец пачаў пісаць у блог па-беларуску



«Лічу неабходным падзякаваць усім фанам БАТЭ за падтрымку, — піша ў сваім інтэрнэт-дзённіку на esport.by/blogi вядомы футбаліст. — Калі чалавеку будзе складана знайсці квіток на гульню чэмпіянату Беларусі, тады можна будзе размаўляць аб прагрэсе нашага футболу».

# Міліцыя разагнала фанатаў стрэламі



9 мая ў Слоніме незадоўга да пачатку матчу чэмпіянату па футболе ў першай лізе паміж мясцовым «Камунальнікам» і бабруйскай «Белшынай» адбылася вялікая бойка паміж фанатамі. Пачасаць кулакі ў Слонім прыехалі фанаты мінскага і брэсцкага «Дынама» і ФК «Баранавічы». Прыезджыя (каля 45 чалавек) наляцелі на мясцовых фанатаў (50—60 чалавек). Каб іх разагнаць, адзін з міліцыянтаў быў вымушаны ўжыць табельную зброю. Ён зрабіў восем стрэлаў у паветра з пісталету. Гэта падзейнічала як халодны душ на ўдзельнікаў бойкі, і яны сталі разыходзіцца.

**Паводле «Газеты Слонімскай»**

# Першая аўтаматычная АЗС

Навінка абыдзецца амаль удвая танней за звычайную станцыю.

У Гродне на вуліцы Курчатава адчынілася першая ў Беларусі аўтаматычная АЗС. Аператара там няма, кіроўцы разлічваюцца праз касавы тэрмінал, які прымае купюры вартасцю ад Br1 тыс. да Br50 тыс. Праз сістэму відэаназірання і аўдыёсувязі АЗС звязаная з цэнтральным офісам.

**СП**



# Памёр былы старшыня баранавіцкай суполкі БНФ 28-гадовы Алесь Пікула

«Хлопца знайшлі памерлым 7 мая раніцай ва ўласнай кватэры», — паведаміў «НН» ягоны сябар. Што магло стаць прычынай для такой раптоўнай смерці, пакуль невядома.

Алесю Пікулу было ўсяго 28 гадоў. У свой час ён узначальваў баранавіцкія суполкі «Маладога фронту» і Партыі БНФ.

У Алеся засталася прыкутая да ложку маці, якую ён дагледжаў. Бацьку забілі ў Расіі, куды ён паехаў на заробкі. Брат жыве ў Мінску.

Пахавалі хлопца 8 мая ў Баранавічах.

**МБ**



# Атамны Млынок

**У гадавіну Чарнобылю мы з сябрам наведалі лес каля вёскі Млынок, што недалёка ад Баранавічаў. Яшчэ 15 гадоў таму нават мясцовае насельніцтва вёскі не магло патрапіць у свой лес: там захоўвалася ядзерная зброя савецкага войска.**



Тая зброя прызначалася для савецкіх самалётаў, што месціліся ў Баранавічах. Далёкая авіяцыя зляцела ў Расію, атамную зброю таксама выцягнулі з нашай зямелькі. І мясцовае насельніцтва, відаць, першым кінулася ў свой лясок, каб паглядзець, што ж тамака рабілася колькі дзесяцігоддзяў. Каб паглядзець і нешта прыдбаць...

Ад Млынка да лесу ляжыць звычайная грунтовая дарога. І раптам мы трапляем на насыпаную дарогу, падобную да грэблі, з бетонных плітаў. Тая вузкая дарога, на адну машыну, (але праз кожныя паўкіламетру з кішэнямі для раз'езду) працягнае лес ад аэрадрому да ядзернага сховішча.

Пад'язджаючы да былога КПП, заўважаеш толькі друз ад чырвонай цэглы. Усе будынкі знішчаныя ці, як мінімум, напалову пабураныя. Беларускі народ не дасць прапасці будаўнічаму матэрыялу. Прыдасца ўсё: і цэгла, і бетонныя бэлькі, і пліты. Савецкія ўмацаванні цяпер расцягваюцца, як раней разбураліся на будаўнічыя матэрыялы палацы і замкі мясцовай шляхты.

Пакінуўшы аўто на шырокім пляцы з такіх самых бетонных плітаў, мы накіроўваемся да бункеру, дзе захоўвалі ядзерныя ракеты. Каля бункеру на нейкае імгненне слупянеем — побач мітусіцца дзесятак хлопцаў у вайсковай форме. На спінах нешта напісана, але не разглядзець, у руках драўляныя калашнікі. Побач некалькі цывільных. Прыпаркаваныя машыны з мінскімі нумарамі. Адчуваем пах шашлыкоў, недзе на бункеры вышынёю з трохпавярховы дом чуюцца галасы дзяўчатаў. «Вайскоўцы» неўпрыкмет знікаюць у лесе, пакідаючы нам здагадкі... Адзін з цывілаў назіраецца да нас, размаўляючы па тэлефоне. Пакуль мы не сыходзім ад бункеру, ён трымаецца за пару крокаў да нас.

Дах бункеру парослы дрэвамі. Для маскіроўкі ад замежных спадарожнікаў. Вароты захавальніку атамнай зброі расчыненыя, паміж плітаў вада... Адчуваеш сябе нейкім сталкерам з фільму Таркоўскага. Сцены спісаныя турыстамі. Кідаецца ў вочы: «Паміраем, але не здаёмся. Дракула».

Недалёка знаходзім другі бункер. Шлях да яго перагароджвае шлагбаўм. Бункер у значна лепшым стане. Дзверы зачыненыя, зробленая выцяжка. Насупраць дзвярэй — купа гнілое бульбы і морквы. Відаць, выкарыстоўваецца цяпер пад захаванне гароднiны.

Па лесе сустракаюцца розныя іншыя паўразбураныя будынкі, прызначэнне якіх застаецца загадкаю. Усю былую вайсковую базу працялі паўцінаю невялікія пракапаныя канавы. Выкопвалі кабелі, каляровы метал! Калючы дрот сустракаецца зрэдчас — перакачаваў амаль увесь у вёску.

З'язджаючы, разумееш, што ў выпадку нейкага канфлікту ад Млынка не засталося б і следу. Як выпарылася б і значная частка Баранавічаў з ваколіцамі. Палова Беларусі была нашпігаваная за СССР войскамі і тэхнікай.

Мы з'язджаем з патэнцыйнага Чарнобылю, Хірасімы ці Нагасакі, які, дзякаваць Богу, скончыў сваё існаванне разам з савецкай імперыяй.

Едзем у Ястрамбель, які побач, глядзець старадаўні маёнтак і закінуты парк.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## ВОДГУКІ

### «Маршруты па Беларусі. Край белай птушкі» (№16)

**Дзякуй, дзякуй Сяргею Харэўскаму за яго краязнаўчыя нарысы.** Будзем чакаць наступныя. Вядома ж, тубыльцам няцяжка заўважыць нейкія недакладнасці ў расповедах «чужога дзядзькі» пра іх родны кут. Ёсць яны і ў нарысе «Край белай птушкі» пра Асвейшчыну. Але не будзем прыдзірацца. Тым больш што папулярны жанр — гэта не навуковы трактат. Хацелася б звярнуць увагу толькі на адзін малавядомы момант — расшыфроўку тапоніму Асвея.

Наш слынны зямляк, асвяяк Міхал Савіцкі выставіў самую аргрунтаваную версію назвы Асвея. Не ад шведаў.

У назве Асвеі да сярэдзіны XX ст. у вымаўленні ніколі не было націску на галосным «е». Старажыхары Асвейшчыны і самі асвеякі дасюль клічуць мястэчка як *Восьвіе*, прычым ніякага роду. У дакументах расейскай дзяржавы назву паселішча пісалі як «Освий», «Освие», пазней — «Освей». У «Słowniku geograficznym krylewstwa polskiego», 1881, гэтая назва пазначана як Oświej.

Заўважым яшчэ, што ў радыюсе 20 км знойдзецца некалькі падобных назваў, напрыклад: Освас, Осунь (Асуна) у Латвіі, Осына, Осуга ў Себежскім раёне Расіі і інш.

М.Савіцкі, спецыяліст па фіна-угорскіх мовах і, дарэчы, расшыфроўшчык назвы «Масква», выводзіць імя роднага паселішча ад слоў «ві» — храм, святое месца — і «ос» — вусце, бераг, мыс. Такім чынам, «Освi» — гэта святы мыс або бераг. Тапаграфія асвейскага берага і археалагічныя знаходкі пацвярджаюць справядлівасць гэтай версіі.

Пасляваенныя, пісьменныя, пакаленні даволі хутка адвыклі ад «тутэйшага», спрадвечнага «Восьвіе», свядома перайшоўшы да больш «граматнага» «Асвея». А шкада — лагоднае гэта імя гучала б так, як вымаўлялі нашы далёкія і блізкія продкі, як вымаўляюць дасюль тыя, хто вырас на асвейскіх берагах.

**Антон Бубала, Верхнядзвінск**

### Усе — на суботнік!

**У каторы ўжо раз людзей прымусілі выходзіць на суботнік перад велікоднымі святамі.** І каталікі, і праваслаўныя кожны год адчуваюць гэты ціск. Трэба і адпрацаваць бясплатна, і «добраахвотна» пералічыць у фонд суботніку дзённы заробак. Каго ні спытаеш — усе супраць. А прапануеш не ісці, то «памяркоўныя» толькі пасміхаюцца.

Звязаныя кантрактамі людзі не могуць адмовіцца ад гэтага прымусу. Страх згубіць працу, даплату да кантракту паралізуе волю. А як кляняць гэтую завядзёнку савецкіх часоў людзі! Гэта трэба чуць. Асаблівы жах для гаспадыняў. Гэта ж трэба і прыбрацца ў хаце, і спячы што-небудзь смачнае, і яйкі пафарбаваць. А тут ідзі ўдзельнічай у адзіным парыве. Несвабодныя людзі, без малога — рабы.

**Сяргей Космач, Маладэчна**

### Водаправоды парамантуйце замест аграгарадкоў

**У Бягомлі ідзе рэканструкцыя. Паднаўляюцца дамы, рамантуецца аўтадарога Мінск—Полацк, спілоўваюцца старыя дрэвы.**

Яшчэ ў нас збіраюцца будаваць аграгарадок. І кажуць, што разам з аграгарадком адрамантуюць вуліцы. А людзі кажуць, што грошы ўваляць у той гарадок, як у балота. Хто будзе ў ім жыць? Заселяць бамжоў, п'янтосаў. Якія з іх працаўнікі? Толькі прыбавіцца клопату ў міліцыі. І ніхто амаль не хоча ўсяляцца туды, бо, як гаворыць пра аграгарадкі ў іншых месцах, дамы праз месяц пачынаюць развальвацца.

За тыя грошы лепш бы заасфальтаваць нашыя вуліцы, па якіх немагчыма не тое што ехаць, а старым людзям і прайсці. Водаправод трэба мяняць... Вось што трэба, а не пустыя аграгарадкі. Дайце людзям справядлівы заробак, і яны самі падбудуюцца.

**Сяргей, Бягомль**

### Кіно і немцы

Успамін з часоў вайны.

Гэтую гісторыю расказаў мне ў 1970-я такі самы, як і я, камандзіровачны. Ён быў старэйшы за мяне і ўспамінаў дзяцінства, якое падчас вайны праходзіла дзесьці ў Гродзенскай вобласці.

Пачатак вайны. Фронт дзесьці па-за межамі краіны. Пачало наладжвацца жыццё. У клубе немцы пачалі круціць кіно для дзяцей. На машыне прывозілі апаратуру і экран, і кінамеханік тут жа ў зале ставіў яго на стол, зацямняліся вокны...

Кіно паказвалі бясплатна, і ў клуб збіраліся ўсе хлапчукі і дзяўчынкі школьнага і дашкольнага веку. Гэты вулей надта зудзеў, але са з'яўленнем святла на экране змаўкаў і толькі раз-пораз узрываўся смехам, рэагуючы на падзеі.

Па заканчэнні сеансу вулей зноў ажываў, пачыналася штурханіна ля выхаду. На гэты вэрхал спакойна, з паразуменнем глядзеў кінамеханік. Старэйшыя дзеці чакалі, калі ён збярэ апаратуру і дапамагалі выносіць яе. Нам, хлапчукам, было за гонар пастаяць побач з кінамеханікам, спытаць, якое кіно ён прывязе ў наступны раз.

Але раз прыехаў іншы кінамеханік, усталяваў апарат і пусціў кіно. Раптам штосьці замільгацела, і стужка абарвалася. У зале стала цёмна, пачуўся свіст і выкрыкі незадаволеных. Кінамеханік падышоў да экрана і сказаў:

— Перастаньце шумець! Склею стужку і дагледзіце кіно!

Па зале пракаціўся яшчэ больш гул, выкрыкі і тупат ног.

— Будзеце пакараныя!

Ніхто не зважаў на гэтыя словы.

Кінамеханік склеіў стужку, дагледзелі кіно, а калі на экране з'явілася «Канец», усе з крыкам і свістам рушылі да дзвярэй. Але каля ўваходу чакалі два немцы з гумавымі дубінкамі. І кожнаму, не зважаючы на ўзрост і пол, дасталося па плячах.

Не ведаю, як успрынялі ўрок другія мае аднагодкі, а я з той пары, нават застаючыся ў лесе адзін, не свістаў. Праз усё жыццё пранёс гэтую навуку і цяпер памятаю.

**Мікалай Грозаў, Вялікія Негнавічы (Барысаўскі раён)**

### Касцёл, які пераехаў

**Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі быў пабудаваны па фундацыі Яна Напалеона Козел-Паклеўскага ў сярэдзіне 50-х гадоў XIX стагоддзя ў радавым гняздзе Козелаў — Сэрвачы, што на Вялейшчыне.**

На хвалі барацьбы з рэлігіяй храм быў перавезены ў вёску Давыдкі і прыстасаваны пад клуб. Пры гэтым цалкам быў зазаваны яго выгляд, адно без вежы-званіцы. Як моладзі стала мала і ацiхла клубнае жыццё, будынак выкарыстоўвалі як жытло для прыезджых рабочых, потым як склад, а зараз ён зеўрае на наваколле пустымі ваканіцамі.

Шкада будзе, калі гэты помнік драўлянага дойлідстваператворыцца ў мясцовы від паліва для сельсавету ці школы. Тым больш, што не такія ўжо вялікія выдаткі трэба, каб перавезці яго ды сабраць на старым намоленым месцы ў Сэрвачы. А там ён разам з гаспадарчымі будынкамі сядзібы Козелаў і іх радавой капліцай-пахавальняй можа скласці цікавую кропку на турыстычнай мапе Вялейшчыны. Тым больш, што мясцовыя жыхары дагэтуль памятаюць пра свой касцёл, што гібее ў Давыдках.

**Вячка Васілёнак, Мінск**

### Філарэт дабраславіў «Пушка»

**Прадаецца на Гарадзеншчыне самае звычайнае, але ўсё ж і незвычайнае марозіва вырабу гарадзенскай кампаніі ААТ «Малочны свет», якое ўвяло мяне ў ступар.** З абгорткі марозіва глядзіць белы ў банціках каток Пушок. Усё б нічога, калі б не надпіс пад партрэтам жывёлы:»Мороженое «Пушок» изготавливается по Благословению Патриаршего Экзарха всея Беларуси, Высокопреосвященнейшего Митрополита Минского и Слуцкого ФИЛАРЕТА».

Якіх толькі мутацый ні ўтворыцца ў краіне праваслаўнага ды іншага атэізму.

**Віталь, Гродна**







### Вершаваны Задыяк

Лёд трашчыць сакавіком —
РЫБЫ руляць плаўніком.

Красавік. АВЕН-баранчык
скача, насіцца па пашы.

Што ЦЯЛЕЦ, а што твой бык,
— цяжкі погляд, грозны рык.

Грэе чэрвень і БЛІЗНЯТАЎ
на цяпло выносяць з хаты.

Ліпеньскаю ночкай РАК
затаіўся ў карчах.

Зойдзе сонейка да ЛЁВЫ —
зацвітуць у садзе зёвы.

Верасеньскім днём сагрэтым
ДЗЕВА ўспамінае лета.

У кастрычнік без развагі ўскладай
свой плён на ВАГІ.

Лісцік курчыцца пад клёнам,
пакусаны СКАРПІЁНАМ.

Засняжыла ўдзень і ўночы —
засляпіла СТРАЛЬЦУ вочы.

На Каляды ля парога
сустракайце КАЗЯРОГА.

ВАДАЛЕЙ у путах лютых —
не ліе, бо лёдам скуты.

**Валянцін Калнін, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Над ракой Арэсай

**Пра Любаншчыну піша Сяргей Харэўскі. Тут ёсць крэйдавыя азёры, экспанаты пра ўнікальную камуну 1929-га. Гэта радзіма Сыракомлі і Шпілеўскага.**



Крэйдавыя кар'еры з смарагдавай вадой.

Ёсць многа нагодаў наведаць Любань — мястэчка над ракой Арэсай. Тое самае, апетае Купалам. У Любанскім музеі сабраныя шматлікія экспанаты, якія падрабязна расказваюць пра жыццё камуны, створанай тут у 1929 годзе. Праўда, пра рэпрэсіі, знішчэнне ўсіх святыняў у ваколіцы, гвалт і высылкі, пра камунараў, што сталі самі ахвярамі рэпрэсіяў, згадак няма. Хоць галоўны герой паэмы «Над ракой Арэсай», Пракоп Адзярыха, у 1937-м загінуў у ГУЛАГу...

Любань вабіць зелянінай, цішынёю і свежым подыхам Арэсы. Ад далейшай мінуўшчыны тут мала што засталося. Данядаўна стаяла драўляная сінагога, якой было больш за паўтараста гадоў. Цяпер сінагогу зруйнавалі, а памятную табліцу... перавесілі на суседні будынак. Таксама, зрэшты, будынак сінагогі.

У Любані ёсць новыя цікавосткі: зграбнае архітэктуры царква і касцёл Маці Божай Фацімскай.

У іншым — гэта райцэнтр з усімі атрыбутамі: бальніца, аўтавакзал, плошча Леніна, Дом культуры, музей, гандлёвы цэнтр, пошта. Модныя завядзёнкі не абмінулі і Любань: закаханыя навешваюць на мост над Арэсаю замкі і замочкі на знак вернасці.

Вылучае Любань вялікае вадасховішча на Арэсе. Тут інтэнсіўна працуе адна з самых магутных у краіне рыбных гаспадарак. Відовішча вялізарнага рукатворнага люстра вады захапляе.

Калі тут адкрылі радовішчы крэйды, сыравіны для вырабу сілікатнае цэглы, адбылося другое нараджэнне Любаншчыны. Між дарогаў відаць у полі вялізарныя крэйдавыя горы. У промнях ранішняга ці вечаровага сонца яны блішчаць бледна-ружовым і каралавым святлом. Фантасмагарычнае відовішча сярод бязлеснае раўніны. Рыхтык, слынная аўстралійская гара Аерс-Рок.

## Слядок Божы

Таксама нечакана сярод поля, між асфальтавых дарогаў, ля вёскі Ператок, можна сустрэць людзей, якія кленчаць ля святога каменю. Яны нясуць сюды вянкі з палявых кветак і ваду. Гэты камень мае назву Слядок Божы, або Божы камень. Людзі ідуць да каменя ў першую нядзелю пасля маладзіка. Яму кладуць ахвяры: малако, мёд, яблыкі і нават запіхваюць у яго адтуліны, нібы ў рот, цукеркі. Гэты шэры умшэлы валун, увесь працяты адтулі-

**Ля вёскі Ператок яшчэ можна сустрэць людзей, якія кленчаць ля святога каменя.**

намі, дзіркамі, паглыбленнямі, нібы павялічаны ў маштабе кавалак вулканічнай пемзы. Хоць гэта — граніт. Многія дзіркі скразныя. Людзі ліюць у іх ваду. Вада, якая пройдзе ў адну адтуліну і выльецца з іншай, лічыцца гаючай. Ёю лечаць розныя хваробы. Калі не замінаць, можна стаць сведкам унікальнага архаічнага відовішча. Старэйшыя людзі з наваколля цалуюць камень і гладзяць, нібы жывога. Шчыра пераказваюць, каму і ад чаго дапамог камень.



«Горы» на даляглядзе.



Слядок Божы — культавы камень, якому дагэтуль пакланяюцца.

Раней, да савецкае ўлады, усё прынесенае на камень забіралі сляпыя старцы, якія жылі ў вёсцы Таль... А калі тут з'явіліся металічныя крыжы, на якія вяжуць ручнікі, ніхто пэўна не скажа. Але нядаўна: мо толькі ў вайну. Ля каменю растуць старыя бярозы. Дзіва, як гэтае святое месца сярод калгаснага поля не разаралі. Значыць, не ўсё так проста было ў краіне вечнага шчасця над ракой Арэсай...

## Радзіма святога

Вялікая вёска Таль, дзе жылі старцы, стаіць сярод рэдкалесся на рэчцы Таліца. Сёння, як і паўсюдна, тут асфальт, бетон, сілікатная тутэйшая цэгла. Уславілася гэта вёска тутэйшым святаром Сяргеем Радакоўскім, далучаным да ліку святых новапакутнікаў XX стагоддзя. Ён служыў тут у 1920-я, камунарскія, гады. Бальшавікі здзекаваліся з святара: абкладалі непамернымі падаткамі, адпраўлялі пад канвоем на лесанарыхтоўкі, адабралі дом. У 1933-м айца Сяргея арыштавалі і расстралялі. А старадаўнюю Траецкую царкву, у якой ён служыў, раскідалі, і з тае драўніны зрабілі клуб. Цяпер новы храм Святой Тройцы стаў галоўнай святыняй гэтых мясцінаў. У храме ёсць і абраз тутэйшага святога, Сяргея Радакоўскага, да якога ідуць маліцца нашчадкі камунараў.

## Аброчная крыніца і адзінаццаць крыжоў

Таксама тутэйшы бацюшка ладзіць малебны і ля святой крыніцы. Яна ў лесе, між вёскамі Дарасіно і Радугай. (Раней вёска Радуга звалася Хацінава, але потым на яе «перанеслі» назоў новага пасёлку-цагельні. Цяпер тая цагельня занята.)

Вакол таемнае святое крыніцы стаяць адзінаццаць драўляных крыжоў. Раней тут на Спаса ладзілі крыжовае шэсце да вады і асвячалі ў царкве садовыя кветкі і гародніну. Традыцыя ўпотай выжыла ў савецкі час. Нават у 1950—1970-я гады тут таемна ладзіліся фэсты. На першы Спас да святой крыніцы сыходзіцца шмат людзей і сёння. Тут асвячаюць мак і мёд. А дахаты вязуць святую гаючую ваду.

## Вёска, дзе цёпла на сэрцы

Па дарозе да Радугі як не наведаць легендарны Смольгаў, котлішча Уладзіслава Сыракомлі? Пасля безлічы пабачаных сілікатных муроў, выпрастаных рэкаў і пыльнай роўнядзі асушаных балотаў, узнагародаю стаецца сімпатычная вёска ў сакавітай зеляніне, за якія два кіламетры ад галоўнае шашы. Дзе ёсць беларуская школа, дзе ўсе гавораць па-нашаму і памятаюць пра «вясковага лірніка». Тут ён і з'явіўся на свет у 1823 г. Тут памятаюць нават апошніх паноў — Мажэйкаў, якія трымалі Смольгаў.

У вайну фальварак згарэў дашчэнту. На тым месцы цяпер яблыневы сад. Памятны валун у гонар Сыракомлі нядаўна ўсталявалі пры мясцовай школе. І заклалі рабінавыя прысады. А ў самой школе імя Сыракомлі — выдатны краязнаўчагістарычны музей. Светла і годна. Калі не такой, то амаль такой хацелася б бачыць і астатнюю Беларусь.

## Смарагдавыя азёры

Але найбольшы эксклюзіў Любаншчыны ляжыць між вёскамі Радугай і Чапаевым. Гэта колішнія крэйдавыя кар'еры, поўныя смарагдавай вады. На картах іх няма, але запытайце — тутэйшыя людзі падкажуць, як да іх праехаць. Вада там найчысцейшая. Зыркае сонца прасвятляе тут бялюткае дно і адлюстроўвае блакіт неба. Крэйдавыя адхоны ўсмоктваюць вільгаць з паветра. Таму яно тут сухое і духмянае. Пахне жывіцаю і крэйдаю. Нібы дзе на далёкім Поўдні. Купанне ў гэтых копанках — суцэльнае задавальненне. Адно што трэба ўхітрыцца не перапэцкацца белай крэйдаю.

## Шыпілавічы

Яшчэ Любаншчына — радзіма Паўла Шпілеўскага, славутага этнографа ды краязнаўца. Вёска Шыпілавічы на ракой Арэсай. Бацька Паўла Шпілеўскага, праваслаўны святар, у 1819 годзе быў накіраваны ў тутэйшую Шыпілавіцкую царкву. Сям'я, у якой было пяцёра дзяцей, якіх даглядала шыпілавіцкая сялянка Агата Касьмінава, пражыла тут шэсць гадоў. Тую сваю няньку Павал Шпілеўскі з любасцю згадвае ў «Падарожжы па Палессі і Беларускім краі» як выдатную апавядальніцу і казачніцу. Шпілеўскі, узгадаваны ў гэтых краях, прысвяціў пазней роднай мове багата навуковых працаў. Ён шчыра любіў Беларусь, захапляўся веліччу яе духоўнай культуры. То бок, у гэтых краях і нараджалася спакваля тая ідэя, што мы завем Беларушчынай.

У часы Шпілеўскіх тут дзейнічала царква, дзе святарыў бацька. У 1930-я яе разрабавалі і раскідалі. Цяпер на царкавішчы ўсталяваны вялікі крыж. Гэта, насамрэч, вельмі прыгожае месца, з якога адкрываюцца самавітыя краявіды. Зрэшты, як і тутэйшая мова і песні. Тыя самыя, што чуў яшчэ Павал Шпілеўскі.





**Любань**

самы паўднёвы горад Мінскай вобласці. Размешчаны на р.Арэса, за 152 км ад Мінску, 25 — ад чыгункі Баранавічы—Асіповічы. У пісьмовых крыніцах згадваецца з XVI ст.

# ВКЛ не прадаецца

**У Мінску прэзентавалі кнігу пра Вялікае Княства Літоўскае. Шасцікілаграмовы фаліянт мае сабекошт 100 еўра. Але купіць яе не будзе як.**

Што хаваецца пад вокладкай з выявамі Гедымінавых слупоў і Ярылавага крыжа? Тэксты беларускіх, літоўскіх, польскіх аўтараў, прадубляваныя на беларускай, польскай, літоўскай і англійскай мовах. Кніга багата аформленая: творы мастацтва з часоў ВКЛ, партрэты палітычных дзеячоў тае пары. Чынны ўдзел у аздабленні ўзяў мастак Зміцер Герасімовіч.

Гэта не гістарычная праца. Канцэпцыя: запрасіць аўтараў з розных краінаў, каб тыя напісалі на тэму ВКЛ. Кожны выбіраў, што блізка сэрцу, кампетэнцыі і навуковым зацікаўленням. Тут і гістарычныя нарысы, і палемічныя зацемкі, і літаратурныя імпрэсіі.

Укладальнік кнігі, мастак Анджэй Струміла, кажа: «Каб напісаць кнігу, я не хацеў ісці да афіцыйных асобаў, хацеў даць слова людзям незалежным, якім можна давяраць». Такімі даверу вартымі асобамі з беларускага боку сталі пісьменнікі Уладзімір Арлоў, Сяргей Дубавец і Сакрат Яновіч, гісторыкі Генадзь Сагановіч і Алег Латышонак, з польскага і літоўскага — лаўрэаты Нобеля Чэслаў Мілаш і Томас Венцлава.

Струміла лічыць, што цяпер, калі Еўропа яднаецца, ёй варта пераняць вопыт народаў, якія ўжо яднаeffектыў раней. І самім народам, якія выйшлі з ВКЛаўскай чугі, успамін пра колішняе задзіночанне не зашкодзіць. Прынамсі, каб знайсці агульную мову. «Мы хацелі падкрэсліць супольны набытак, — дадае Струміла. — Напрыклад, сказаць сучасным літоўцам, што ў Літве не ўсё літоўскае. Віленскі ж універсітэт заснаваў польскі кароль, венгр з паходжання, Сцяпан Батура. Сказаць палякам, што яны шмат чаго атрымалі ад Вялікага Княства: душэўныя энергіі, рамантычны дух. Хто біўся пад Оршай? Праваслаўны князь Астрожскі. А беларусам давесці, што яны былі ў ВКЛ адным з народаўстваральнікаў». Прафесар Адам Мальдзіс згодны, што спадчыну ВКЛ і постаці польска-беларуска-літоўскага памежжа дзяліць нельга. «Вось Манюшку, які доўга жыў у Мінску, працаваў дырыжорам у Вільні і стаў стваральнікам польскай класічнай оперы — як дзяліць?»

**Анджэй Струміла**

**мастак, скульптар, гаспадар творчай сядзібы на Сувальшчыне (Падляшша). Нарадзіўся ў Вільні, куды яго бацька ўцёк з Мінску ад бальшавікоў. Выхаванец Навагрудскай гімназіі. Маляваць вучыўся ва Уладыслава Стшэміньскага, аднаго з бацькоў усходнееўрапейскага авангарду і вучня Юдаля Пэна. Струміла — у сваю чаргу — настаўнік Лёніка Тарасевіча, самага славутага мастака беларускага паходжання ў Польшчы.**

Сяргей Дубавец лічыць, што спадчына ВКЛ цяпер у свядомасці шмат каго з беларусаў прымаецца як нешта супольнае: «Калі я гляджу на пакаленне сваіх дзяцей, бачу, што на іх скончылася традыцыя дзяльбы ВКЛ».

Кніга выдавалася не для продажу і паступіць у бібліятэкі і грамадскія ўстановы Беларусі, Літвы і Польшчы.

**Лявон К**



**Выстава графікі Анджэя Струмілы**

**Разам з кнігай пра ВКЛ Струміла прывёз у Мінск уласную графіку: кніжныя ілюстрацыі, малюнкі натуры і графічную серыю «Метафара». Яго персанальная выстава «Зямлі майго бацькі» будзе праходзіць у галерэі «Акадэмія» (вул.Сурганава, 14) да 30 траўня.**

# Памяняйце радыё на сеціва

**Або чыста беларускі драйв у англійскім фільме. Пра стужку «Рок-хваля» піша Павал Касцюкевіч.**

Кепскія навіны: рок-н-рол даўно памёр. Добрыя навіны: укладальнікі эпітафій па-ранейшаму стрыгуць купоны. Веснавая «Рок-хваля» — аднаяйкавы блізнюк зімовых «Стылягаў» Тадароўскага: гісторыя сталення хлопца, які абраў шлях быць не як усе. Аповед, за якім праглядаецца гісторыя сталенне заходняга грамадства.

Тэма рок-н-ролу чарговы раз паспяхова закрытая. Сюжэт такі. Мама пасылае сына-боўдзілу, выключанага са школы, дабраць розуму да хроснага бацькі — і куды! — на карабель, поўны распасвеных, лёгкіх на язык і ўчынкі радыёвядоўцаў, што працуюць на пірацкім «Радыё Рок». Сэкс, наркотыкі і ўсё такое па поўнай праграме на асобна ўзятай палубе. І, вядома, кепскія дзядзькі з ураду Яе Вялікасці ў зашпіленых на ўсе гузікі гарнітурах, бы акулы, кружляюць вакол і прагнуць крыві. Антысістэмная рыторыка: мы супраць іх, яскравая асоба vs. шэры афіцыёз. І, пэўна, для англа-амерыканскага вуха «Маё пакаленне» гурту The Who і «So Long, Marianne» Леанарда Коэна кладзецца гаючым бальзамам гэтаксама, як для постсавецкага «Скутыя адным ланцугом» «Наўтылусаў».

А яшчэ: памяняйце Ангельшчыну 1960-х на Беларусь 2000-х, а радыё — на сеціва.

Умоўнасць сюжэту, нацягнутасці і нестыкоўкі агінаюцца зухаватымі досціпамі, кпінкамі і выдатнай ігрой актораў. Сюжэт забівае такія фільмы, усё роўна як гісторыя згубіла рок-н-рол: вось было б добра, каб давеку — вечнае сёння: без адхаднякоў, зморшчынаў і патрэбы рабіць нешта новае. Каб увесь час заставацца ў гэтым зыркім святле пражэктараў.

Але і што з таго, што памёр! Рок-н-рольныя забавы Леанарда Да Вінчы з фарбаваннем у залаты колер натуршчыкаў і неймаверным вынаходствам верталётаў таксама мінулі.

У Мінску гэтая, ці не найяскравая стужка году, ідзе толькі ў кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20) — не прапусціце!

**«Рок-хваля»** — The Boat That Rocked, Вялікабрытанія—Нямеччына, 2009, 129 хв.




**Чаму варта глядзець гэты фільм:**

1. З-за саўнтрэку, з любасцю і дарэчнасцю падабранага: Джымі Хендрыкс, Леанард Коэн (тут глядзець не абавязкова — досыць падчас сеансу раз-пораз мройна заплюшчваць вочы).

2. З-за дыхтоўна-разняволеных жэстаў Рыса Іванса, што грае рок-н-рольнага радыёвядоўцу Жыгала. Выдае, што Рыс у сваёй акторскай кар'еры дайшоў да кандыцыі, дарэчы, як і іншы брытанец, Біл Наі (грае дырэктара радыё, станоўчую акулу шоўбізу).

3. Каб зразумець, адкуль пайшлі выразы «пірацкае радыё» і «пірацкія дыскі».

# Што было за фасадам

**Адзін з «гістарычных» дамкоў на плошчы ў Міры выявіўся складзеным з сучаснай сілікатнай цэглы. Гэтак яго рэстаўравалі ў 2002-м.**


СЯМЁН ПЕЧАНКО

Мала хто з беларусаў не ведае мястэчка Мір з славутым на ўсю краіну замкам ды прыхарошанай сем гадоў таму плошчай. Хто ў Міры не быў, мог пабачыць і замак, і мястэчковую плошчу ў знятым там летась навагоднім мюзікле «Батлейка». Цяпер жа ад аднаго з адноўленых і стылізаваных колькі гадоў таму «пад старыну» будынкаў застаўся толькі фасад. Будынак належыць «Беларусбанку». Зайшоўшы ў сярэдзіну таго, што засталося ад аддзялення № 411/7, можна пабачыць, што сцены ягоныя выкананыя з сілікатнай цэглы і блокаў, то бок з сучасных будматэрыялаў. «Мы пачалі рамонт у будынку два тыдні таму, ён быў у аварыйным стане, у працэсе стала зразумела, што давядзецца яго знесці», — патлумачылі ў мірскім філіяле банку. Са словаў супрацоўніка банку, будынак да верасня будзе адноўлены ў «першапачатковым стане». Дамок, як і астатнія збудаванні паабапал мірскай плошчы, не занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Сучасны выгляд плошча мястэчка набыла ў 2002 г., калі ў Міры адзначаўся Дзень беларускага пісьменства і друку. Навуковым кіраўніком Замкавага комплексу «Мір» быў Дзмітрый Бубноўскі. Ён кіраваў і працамі ў мястэчку. Частку дамкоў к.XIX — п.XX стст. паабапал плошчы знеслі, збудаваўшы гатэль і кавярню, рэшту перарабілі пад крамы і банкі.

Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі культуры» Антон Астаповіч кажа, што выпадак у Міры наглядна ілюструе, якім чынам у сучаснай Беларусі абыходзяцца з архітэктурнай спадчынай: «Гэта тыповы прыклад рэканструкцыі пабеларуску, калі пад пэўную нагоду разбураецца гістарычная забудова, а на яе месцы наспех будуецца муляжы». Пагаджаецца з ім і мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі: «Хто будзе шкадаваць у будучыні тыя сілікатныя муляжы, калі ў іх не засталося нічога аўтэнтычнага?» Тое, што будучыня падобных прадуктаў сучаснай рэканструкцыі можа быць і вельмі блізкай, засведчыў будынак у Міры — з моманту апошняга аднаўлення не прайшло і сямі гадоў.

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

### Мінскі Ленін трапіць у спіс ЮНЭСКА?

Рыхтуюцца дакументы, каб уключыць помнік Леніну на плошчы Незалежнасці ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны ЮНЭСКА.

Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Мінкультуры.

### Зачынілі «Гудвін»

Прычына — адміністрацыя Цэнтральнага раёну Мінску абмежавала графік працы клубаў і салонаў, якія месцяцца ў жылых дамах. Аляксандр Півальцэвіч, дырэктар ІАА «Гудвін і Ко», кажа: «Паводле будаўнічых нормаў, клубы ў жылых дамах, мусяць зачыняцца а 23-й, але ж нам працаваць без начных мерапрыемстваў нерэнтабельна. Мы вымушаныя былі зачыніцца». Работнікі «Гудвіну» засталіся без працы. «Гэта была зручная пляцоўка для невялікіх канцэртаў», — шкадуе з нагоды закрыцця клубу Віталь Супрановіч, арганізатар канцэртаў беларускіх музыкаў.

### Уладзімір Арлоў перанёс аперацыю на сэрцы

6 мая пісьменнік Уладзімір Арлоў перанёс чарговую аперацыю на сэрцы. Аперацыя мела планавы характар пасля тэрміновага хірургічнага ўмяшання паўгадовай даўніны па выдаленні тромбаў і ўстаноўцы стэнтаў у сэрцы. Аперацыя патрабавалася, каб паглядзець, як прыжыліся стэнты і як функцыянуе сэрца пісьменніка. У.Арлоў добра перанёс аперацыі і цяпер адчувае сябе някепска.

### Нямецкі раман пра Кубэ і Мазанік

7 мая ў Мінскай абласной бібліятэцы адбылася прэзентацыя раману нямецкага пісьменніка і гісторыка Паўля Коля, які выйшаў у перакладзе на беларускую мову пад назвай «Найлепшыя прывітанні з Мінску». Дакументальны раман распавядае пра дэпартацыю яўрэйскай сям'і з Кёльну ва акупаваную Беларусь. У яго аснову пакладзеныя шматлікія даследаванні, прысвечаныя Вільгельму Кубэ, які з 1941 па 1943 гады быў генеральным камісарам Беларусі, інтэрв'ю з Аленай Мазанік, якая здзейсніла замах на яго, а таксама з Анітай Кубэ.

### Перазагрузка. Tanin Jazz

Англамоўны джаз-поп-гурт Tanin Jazz перазапіша пабеларуску свой хіт «My Baby». Музыкі бяруць удзел у праекце «Тузін. Перазагрузка» інтэрнэт-парталу «Тузін Гітоў» і грамадскай кампаніі «Будзьма беларусамі». Перакладаць песню возьмецца літаратар Віталь Воранаў.

**СМ; паводле ЛК, БелаПАН, «Тузін Гітоў», inf.by, «Вечерний Гродно», «Мінск-навіны»**

# З Койданаўскага гета ў латышскае СС

Як габрэйскі хлопчык з Койданава стаў сімвалам нацысцкай прапаганды — «самым маладым жаўнерам Рэйху». Лёс Іллі Гальперына — Ульдзіса Курземніекса — Алекса Курзема. Піша **Алег Дзярновіч**.

У цэнтры гэтай гісторыі знаходзіцца Беларусь. У яе абсягі трапляе Латвія, Германія, Аўстралія, Вялікабрытанія. Але да апошняга часу беларускія рэаліі амаль не гучалі ў прэсе і ў кнігах, якія паспелі з'явіцца. Гэтая гісторыя пра габрэйскага хлопчыка з Койданава Іллю Гальперына ў гады другой сусветнай вайны — не толькі пра цуд выратавання, але і пра цану выжывання. Неверагодныя абставіны і сенсацыйнасць падзей, нават на фоне той вайны, ужо былі тэмай жывых абмеркаванняў. Але некаторыя сюжэты так і засталіся непрагаворанымі.

### Уратаванне

Нагадаем для пачатку канву. Койданава. 1941 год. Калі горад быў заняты немцамі, новая ўлада ўтварыла гета, куды былі сабраныя мясцовыя габрэі. А ўжо 21—22 кастрычніка 1941 г. яны, каля 1600 чалавек, былі расстраляныя ў бліжэйшым лесе. Экзекуцыю, праўдападобна, праводзіў літоўскі паліцэйскі батальён. У ноч напярэдадні расстрэлу пяці- ці шасцігадовы Ілля уцёк з гета, пачуўшы ад маці, што заўтра яны загінуць.

Ілля бачыў зводдаль той жудасны расстрэл: «Памятаю кусаў руку, каб не плакаць наўзрыд, — распавядаў ён пасля. — Я баяўся, што мяне знойдуць у лесе. Напэўна, я некалькі разоў губляў прытомнасць. Гэта было жахліва. Калі страляніна спынілася, я не ведаў, куды ісці. Я застаўся зусім адзін».

Далей былі блуканні па зімовых лясах і вёсках. Хто падкормліваў, а ў каго, трэба меркаваць, бадзяга проста краў харчы: «Я грукаўся ў хаты, і людзі давалі мне лусту хлеба, але казалі, каб я сыходзіў. Ніхто мяне не прытуліў». Ад марозу ратавала адзенне, знятае з забітых жаўнераў.

### Талісман

У часе блуканняў габрэйскі хлопчык натрапіў на 18-ы Курляндскі ахоўны батальён, які пазней стаў часткаю Вафен-СС. Ілля Гальперын не можа зразумець, чаму латышскі сяржант Екабс Куліс пашкадаваў яго. Захаваць таямніцу сапраўднага паходжання Іллі дапамагла яго арыйская знешнасць. Ён набыў новае імя і новую біяграфію. Меркаваны беларускі сірата стаў «сынам палка» пранямецкай вайсковай адзінкі, яму далі імя Ульдзіс Курземніекс (што азначае — курземец, жыхар Курземе (Курляндыі) — заходняй правінцыі Латвіі). Для маленькага жаўнера пашылі мундзір, які вельмі яму падабаўся. З батальёнам Ульдзіс пабываў на Усходнім фронце, пад Волхавам, у аблозе Ленінграду. Ён стаў нібы талісманам аддзелу.

Можна толькі здагадвацца, што яшчэ пабачыў маленькі жаўнер у Беларусі і на фронце. Але не менш напоўненым сімваламі было яго жыццё ў Рызе ў 1943—1944 гг. Ульдзіс трапіў пад апеку сям'і Екаба Дзеніса — героя барацьбы за незалежнасць Латвіі і дырэктара шакаладнай фабрыкі «Лайма». Захаваўся прапагандысцкі фільм: хлопчык у нямецкім мундзіры абыходзіць у шпіталі параненых жаўнераў Вермахту і раздае ім шакаладкі «Лаймы». Нават дзеці змагаюцца — такі быў лейтматыў стужкі. Праўдападобна, фільм бачыў Гітлер і ўхваліў. Так габрэй з Койданава стаў сімвалам нацысцкай прапаганды — «самым маладым жаўнерам Рэйху». Стужку паказвалі ва ўсіх нямецкіх кінатэатрах.



Найслыннейшы здымак Алекса Курзема. Праўдападобна, зроблены на чыгуначнай станцыі ў Слоніме. 1942 г.

Жыццё Ульдзіса ў Рызе скончылася з наступам Чырвонай Арміі. 21 кастрычніка 1944 г., у трэцюю гадавіну знішчэння Койданаўскага гета, ён з сям'ёй Дзенісаў назаўжды пакінуў Латвію на борце лайнера «Генерал Штойбен». Гэты карабель у 1944—1945 гг. здзейсніў некалькі эвакуацыйных рэйсаў, вывозячы з Латвіі і Літвы мясцовых цывільных і параненых нямецкіх жаўнераў. І менавіта той лайнер 10 лютага 1945 г. патопіць савецкая субмарына пад загадам славутага капітана Марынеску. Тады на дно пайшло 3,5 тысячаў чалавек — больш, чым у катастрофе «Тытаніку».

### Успамін

Пасля капітуляцыі Германіі Ульдзіс знаходзіўся ў лагерах для перамешчаных асобаў у Заходняй зоне, а ў 1949 г. выехаў у Аўстралію. Там яго імя адаптавалі на англійскі лад — Алекс Курзем. І пачалося размераныя клопаты жыхара шчаслівай краіны. З'язджаючы з Еўропы, ён сказаў сабе: «Забудзься на мінулае. Ты едзеш у новую краіну, пачынаеш новае жыццё». Курзем усім казаў, што яго бацькі загінулі ў часе вайны, але ў дэталі не ўлазіў. Ён так шмат перажыў у дзяцінстве, што рэшту жыцця вырашыў правесці як сапраўдны латыш: не спяшаючыся, не прыцягваючы да сябе ўвагі.

Толькі ў канцы 1990-х, рыхтуючыся да аперацыі, Алекс спужаўся, што можа памерці пад чужым імем. Свайму сыну Марку, выкладчыку Оксфардскага універсітэту, ён распавёў урыўкі сваіх успамінаў, захаваныя ў далёкіх схованах памяці. І ўжо Марк Курзем, узброены веданнем методык і архіваў, распачаў аднаўленне сапраўднай біяграфіі бацькі.

### Вяртанне

У Дзяржынску, па вуліцы Кастрычніцкай, 12 яны знайшлі нават дом Гальперыных, 1900 году будоўлі. Цяпер там жыве беларуская сям'я. Не захавалася толькі печ, у якой хлеб пяклі, а так — усё, як было. «Выгоды» паранейшаму на двары. Беларуская правінцыя па якасці жыцця так мала змянілася ад пачатку XX ст.! Прыходзяць і сыходзяць толькі людзі і этнасы.

Былі і іншыя сенсацыі. Аказалася, бацька Іллі, Саламон Гальперын, таксама выжыў. Пасля вайны ён стварыў новую сям'ю, а яго сын, друкар Эрык Гальперын, і сёння жыве ў Мінску.

Марк Курзем напісаў кнігу «Талісман. Раскрыццё тайны нацысцкага маленства майго бацькі» (2007). Скептыкі сумняваліся ў праўдзівасці ўспамінаў Алекса Курзема. Маўляў, хлопчык быў нашмат старэйшым і сам далучыўся да нацыстаў. Нью-Ёркская асацыяцыя ахвяраў Халакосту запатрабавала прыцягнуць койданаўскага аўстралійца да адказнасці за супрацоўніцтва з карнікамі. Але габрэйская даследчая група з Мінску пацвердзіла многае з таго, што распавёў Курзем, і даследчыкі Халакосту змянілі рэзалюцыю.

Курзем стаў медыйнай персонай. Апроч артыкулаў у прэсе, з'явілася яшчэ адна кніга, якую напісалі два журналісты польскай Gazety Wyborczej Пётра Глухоўскі і Марцін Кавальскі — «Не трэба мяне забіваць» (2008). Яны запрасілі аўстралійца ў Польшчу, дзе правялі багата часу ў размовах і ў падарожжы з ім па краі. Журналісты імкнуліся адшукаць хоць нейкія повязі героя з Польшчай. (Яго роднае Койданава ад чэрвеня 1932 г. стала Дзяржынскам і цэнтрам польскай аўтаноміі ў БССР, якая пратрымалася да 1937 г.). Таму з цікавасцю рэагавалі на асобныя словы Алекса, якія ён памятаў з далёкага дзяцінства. Напрыклад, «папіросы» — ага, гэта па-польску, не «сігарэты», як па-расійску...



PHOTOBYMEDIANET

AGENCJA GAZETA

Алекс Курзем у Асвенціме. 2007 г.

Сам Алекс Курзем не ўкаранёны ні ў якую нацыянальную традыцыю. Ён вымушана пераваў з латышскім асяроддзем. У яго нічога няма ад габрэйскай традыцыі, якую яму папросту не паспелі прышчапіць. І гэта добра відаць у стужцы Марыі Дрэгер «Усё, каб жыць», знятай па выніках паездкі Алекса ў Польшчу. У Варшаве юдэі прапанавалі яму разам памаліцца ў сінагозе. На развалінах свайго жыцця Алекс не верыць ні ў аднаго бога. Відаць, як падчас юдэйскай малітвы яму ніякавата. Калі ж Глухоўскі і Кавальскі запыталіся ў Алекса, кім ён сябе адчувае, той адказаў: «Хутчэй беларусам, чым габрэем».

Да такога адказу я быў наймянш падрыхтаваны. Колькі ведае тае Беларусі Алекс Курзем?! Толькі тое, што там жыла яго сям'я... Але і цяпер там жывуць яго брат, пляменнікі, кузіна. Здаецца, я зразумеў. Беларусы — гэта як гліна, як прырода. Яны ёсць, але яны і нейтральныя. Беларусам можа стаць амаль кожны, калі хто захоча і калі паўстане такі выбар.

### А як з Латвіяй?

Як толькі Алекс у 1997 г. пачаў узгадваць, латышская супольнасць Аўстраліі пачала вінаваціць яго ў дыскрэдытацыі яе добрага імя. А яшчэ раней раздаваліся ананімныя тэлефонныя званкі і прыходзілі лісты: «Ты адзін з нас, быў пры тым, усё бачыў. Мы ўвесь час сочым за табой... Жыццём ты абавязаны толькі нам... Маўчы».

Калі сяржант Екабс Куліс у 1942 г. знайшоў сірату, ён зразумеў, што той габрэй. Латыш не проста змаўчаў, але загадаў і знойдзенаму хаваць таямніцу. Напэўна ж, і сёння Алекс распавёў са сваёй службы яшчэ не ўсё.

Беларускі гісторык Аляксей Літвін вывучаў дзейнасць латышскіх паліцэйскіх батальёнаў у Беларусі. Акупаваная немцамі Беларусь была ўключаная ў Рэйхскамісарыят Остланд з сядзібай у Рызе. Як высветліў А.Літвін, 18-ы латышскі паліцэйскі батальён у колькасці 395 чалавек прыбыў у аператыўнае падпарадкаванне камандавання паліцыі бяспекі Беларусі ў маі 1942 г. з Рыгі і дыслакаваўся ў Стоўбцах. А.Літвін адзначае, што «ў гістарычнай памяці беларускага народу аб латышскіх паліцэйскіх батальёнах... засталіся негатыўныя звесткі, як аб карніках, многія з якіх размаўлялі па-расійску і вызначаліся жорсткасцю ў адносінах да беларусаў».

Чаму немцам удалося рэкрутаваць у свае вайсковыя адзінкі вялікую колькасць латышоў? Трэба памятаць і адчуць увесь жах латышоў, калі іх рэспубліка, першая іх дзяржава, была акупаваная 17 чэрвеня 1940 г. саветамі. На іх зямлю прыйшла ўлада, якая не прызнавала прыватнай уласнасці і для якой не існавала асабістых правоў. Масавыя дэпартацыі з Латвіі пачаліся ўжо ў 1941 г. і дасягнулі піку 14 чэрвеня — у той дзень было выслана больш за 15 тыс. чалавек. І калі часткі Вермахту ў тым жа месяцы ўвайшлі ў Латвію, невялікі край даў найбольшую колькасць жаўнераў у войскі Вафен-СС — каля 150 тысячаў чалавек, больш чым венгры, нарвегі, фіны і эстонцы разам узятыя. Латышскія жаўнеры разам з немцамі за тэрыторыю Латвіі біліся да апошняга — Курляндская групоўка здалася толькі 9 мая 1945 г., пасля капітуляцыі самой Германіі.

Латышы дорага заплацілі за калабарацыю: пасля вайны высяляліся цэлыя мястэчкі, дэпартацыі пазбавілі Латвію нацыянальнай эліты, а народ — шчыльнай сувязі са сваёй зямлёй. Быў штучна створаны дэфіцыт працоўнай сілы, які папаўняўся за рахунак эмігрантаў, пераважна з РСФСР.

Сёння латышскія гісторыкі і палітыкі востра рэагуюць на абвінавачванні ў саўдзеле латышскіх вайсковых аддзелаў у генацыдзе габрэяў. Калі ў Чэхіі рыхтаваўся пераклад кнігі Марка Курзема «Талісман», латвійская амбасада як афіцыйную інфармацыю распаўсюдзіла рэцэнзію на тэкст кнігі. У гэтым тэксце даследчык з Музею акупацыі Латвіі Ульдзіс Нейбург пералічыў шэраг фактычных недакладнасцей у кнізе.

Сам жа Алекс Курзем у шматлікіх інтэрв'ю падкрэслівае, што ён удзячны латышам, якія яго выратавалі. У адказ на абвінавачванні латышоў ён адказвае, што адносна яго яны заўжды паступалі добра. «Яны занялі месца маіх бацькі і маці».




## КАНЦЭРТЫ

### Блюз ад Юрыя Несцярэнкі

**14 мая ў зале Тэатру рускага рамансу (вул.Чыгуначная, д. 27, корп. 2)** — канцэрт Юрыя Несцярэнкі (лідэра гуртоў «White Night Blues», «Nestary Band»). **Пачатак а 19-й.**

### Стары Ольса ў Гродне, Брэсце і Астрамечаве

**14 мая ў гродзенскім тэатры лялек** адбудзецца сольны канцэрт «Старога Ольсы». **15 мая** «Стары Ольса» выступае **ў Брэсцкім тэатры драмы і музыкі (вул.Леніна, 21)**. **16 мая** музыкі зайграюць **у Астрамечаве (Брэсцкі раён)**. **Пачатак канцэртаў а 19-й.** Даведкі: (029) 324–52–40 (Кацярына).

### Зміцер Вайцюшкевіч у Казе

**14 траўня на малой сцэне к/з «Мінск»** — канцэрт Змітра Вайцюшкевіча. **Пачатак а 19-й.**

### Рок-фэст «Bela music-09»

Першы рок-фестываль «Bela music–09» пройдзе **23 траўня на адкрытай пляцоўцы аэраклубу «Баравая»**. Сярод удзельнікаў фэсту гурты **Neuro Dubel, Палац, Крама, J:морс, Без Білета, Дзедзецей. Пачатак у 16.30. Спецмаршрут: ст. м. «Усход» — «Баравая». Квіткі: 20 000 руб.** Набыць квіткі можна праз сайт. Даведкі праз т.: (029) 655–55–96, (033) 655–55–96

## ІМПРЭЗЫ

### Беларуская вясна ва Украіне

**Да 18 мая ва Украіне** праходзіць фестываль сучаснай беларускай культуры «Беларуская вясна 2009». **У Кіеве ў галерэі «РА», (вул.Б.Хмяльніцкага, 32)** — фотавыставы беларускіх творцаў.




### Літаратурная імпрэза Арлова і Ірванца ў Кіеве

**14 траўня у 18.30 ў кнігарні «Є» (вул.Лісенка, 3)** — сумесная літаратурная імпрэза пісьменнікаў Уладзіміра Арлова і Аляксандра Ірванца.

### Творчаму роду няма пераводу

**15 мая ў бібліятэцы імя Цёткі (вул.Талбухіна, 12а)** адбудзецца вечарына «Творчаму роду няма пераводу». Жонка Галіна Дубянецкая і муж Сяргей Сыс, муж Яраш Малішэўскі і жонка Аксана Спрынчан, жонка Людміла Рублеўская і муж Віктар Шніп, муж Максім Клімковіч і жонка Ірына Клімковіч, брат Вадзім Клімовіч і сястра Наталля Клімовіч, сёстры Яна Шаляговіч і Хрысціна Шаляговіч, дзед і бацька Міхась Шавыркін, дачка і маці Міраслава Навіш, дачка і ўнучка Вальжына Прохарава. У антракце — адкрыццё выставы сям'і Алены Масла. **Пачатак а 18-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Ноч музеяў

**16 мая з 19.30 да 00.00 мастацкі музей** запрашае наведаць «Усходнюю ноч», у рамках якой адбудзецца адкрыццё трох выставаў: «Людзі Егіпта» беларускага фотамастака Вадзіма Качана, «Схаваная Японія» сучаснага японскага майстра графікі і дызайну Яхагі Кідзюра і ўнікальная выстава злепкаў старажытнаегіпецкіх скульптураў з фондаў Нацыянальнага мастацкага музею Рэспублікі Беларусь. Апроч экспазіцыяў, у праграме «Усходняй начы» — тэатралізавана-мастацкае прадстаўленне «Калейдаскоп усходніх мрояў», на якім можна ўбачыць мастацтва каліграфіі і арыгамі, тэхніку малявання пяском па шкле — пескаграфію. Наведнікі акцыі «Ноч музеяў», якія прыдуць у мастацкі музей у традыцыйных колерах Усходу — чырвоным альбо залатым — атрымаюць права на бясплатны ўваход.

### Дзіцячы малюнак

**Да 14 мая ў мастацкім музеі працуе** IV Міжнародная выстава дзіцячага малюнку, у якую ўвайшло 56 дзіцячых працаў з 14 краінаў свету

### Цеплыня святла

**Да 23 чэрвеня ў мастацкім музеі** працуе выстава Васілія Касцючэнкі «Цеплыня святла».

### Пейзажы ўяўленняў

**У музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 29 мая** працуе выстава «Пейзажы ўяўленняў» Лешака Мондзіка

## ТЭАТРЫ

### Старамодная камедыя

У жніўні 1968 г. на Рыжскім узмор'і сустрэліся Ён і Яна. Яна — эксцэнтрычная былая артыстка. Ён — урач, загадчык аддзялення ў санаторыі. Такія розныя і непадобныя адзін да аднаго! Але ў абаіх за плячыма доўгае і няпростае жыццё, здабыткі і страты, а наперадзе, здаецца, толькі адзінота і ўспаміны... Але яны сустракаюцца — і пачынаецца гісторыя, поўная лірызму і насталгіі, гумару і суму. Старамодная гісторыя пра вечныя пачуцці...

Мэтр айчыннай рэжысуры народны артыст Беларусі Валерый Раеўскі паставіў гэты камерны спектакль да юбілею заслужанай артысткі Аўтаномнай Рэспублікі Крым Алы Ельяшэвіч, якая ў дуэце з заслужаным артыстам Беларусі Уладзімірам Рагаўцовым прадстаўляе яго на суд гледачоў.

**Паводле Прэс-службы Купалаўскага тэатру**

### 14 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Беларусь у фантастычных апавяданнях» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 15 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»
**Музычны тэатр** — Юбілейны вечар Наталлі Гайды
**Тэатр оперы і балету** — «Бахчысарайскі фантан»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

### 16 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Старамодная камедыя» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Ідылія»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»
**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэрак»
**Музычны тэатр** — «Дарагая»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Тэатр оперы і балету** — «Кармэн»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

### 17 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Ау»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Музычны тэатр** — «Баль кветак».
**Тэатр оперы і балету** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

### 18 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Старамодная камедыя» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр оперы і балету** — «Набука»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»

### 19 мая

**Тэатр юнага гледача** — «Сястра мая Русалачка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Музычны тэатр** — «Лятучая мыш»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго гораду»

### 20 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Востраў Сахалін» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр оперы і балету** — «Жызэль»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

### 21 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Музычны тэатр** — «Шклянка вады»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзюшкін сон»
**Тэатр лялек** — «Чайка. Спроба прачытання»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

### 22 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Таполевая завея»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзікае паляванне караля Стаха» (Малая сцэна)
**Тэатр оперы і балету** — «Баядэрка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Музычны тэатр** — «Марыца»

### 23 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Апельсінавае віно»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладына»
**Музычны тэатр** — «Айбаліт–2002»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

### 24 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзень народзінаў ката Леапольда»
**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр оперы і балету** — «Лебядзінае возера»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Аповесць не пра вайну

**Асуджаныя на вайну** (Обречённые на войну)
Расія, 2009, каляровы, 94 хв.
**Рэжысёрка:** Вольга Жуліна
**Жанр:** Драма паводле аповесці Васіля Быкава «Пайсці і не вярнуцца»
**Сцэнарная адаптацыя:** 8 (з 10 балаў)
**Акторская гульня:** 7
**Рэжысура:** 5




На тле фальшывага пафасу з чырвона-зялёнымі і жоўта-чорнымі стужкамі, з румянымі афіцэрамі на тэлеэкранах і бадзёрым бразгатам зброі не кожны заўважыць ціхую стужку «Асуджаныя на вайну». Але карціна, знятая расійцамі, — экранізацыя аповесці Васіля Быкава «Пайсці і не вярнуцца».

Васіль Быкаў — адзін з самых кінематаграфічных пісьменнікаў, але далёка не ўсе фільмы паводле яго твораў узнімаліся да арыгіналу. (А аповесць «Пайсці і не вярнуцца» ставіцца ўжо трэці раз.) Простасць гісторыі пра разведчыцу Зосю, якую вырашае здаць у паліцыю закаханы партызан-перабежчык, — падманлівая.

Калі «Беларусьфільм» уцякае ад беларускай мовы, як чорт ад ладану, дык у расійскім фільме галоўная гераіня збольшага гаворыць па-беларуску. Жывая гутарка даўно нікога не здзіўляе (акрамя саміх беларусаў), расійскія крытыкі адрэагавалі на мову вельмі станоўча.

Саліруе ў фільме Ніна Лашчыніна, якая аддана грае сваю гераіню. Крохкая Зося, амаль дзіця, якая выпрабоўваецца здрадай і холадам, і, нягледзячы на вонкавую слабасць, маральна перамагае — тыповая быкаўская гераіня. Майстэрству актрысы не замінае ні няўпэўненая рэжысура, ні лішняя — эратычная — сцэна. Нават празмерная музыка не здольная заглушыць этычны катэгарызм быкаўскае аповесці.

Тая ваенная аповесць Быкава, на самой справе, не пра вайну. Яна пра чалавека ўвогуле. Чалавека ва ўсе часы і для ўсіх народаў. Чалавека, які абірае паміж злом і дабром.

А расійская стужка — нагода ўзяць у рукі беларускую кнігу.

**Андрэй Расінскі**

# «Наш малады Саша скарыў норгаў»

**Упершыню на «Еўрабачанні» выступілі адразу два беларусы: адзін прадстаўляў нашу краіну, другі — Нарвегію.**



14 мая ў паўфінале «Еўрабачання» пад шостым нумарам выступіць наш зямляк. Аляксандр Рыбак з сваёй песняй «Fairytale» («Казка») — сярод фаварытаў конкурсу. Зрабіўшы фурор у часе адбору, ён займеў нямала прыхільнікаў у Беларусі. Кіраўнік беларускай дэлегацыі Аляксандр Мартыненка нават назваў яго большым патрыётам Беларусі, чым Пётр Ялфімаў, які сёлета прэзентуе Беларусь на «Еўрабачанні» ў Маскве.

Пра тое, як поспехі нашага земляка ўспрымаюць у Нарвегіі, ці ведаюць пра ягонае паходжанне, распавёў паэт Славамір Адамовіч, які жыве ў гэтай паўночнай краіне: «Магу сказаць, што юнак нарабіў шуму ў Нарвегіі, збольшага пра яго паходжанне народ ведае. Былі інтэрв'ю з бацькамі. Наш малады Саша скарыў норгаў непасрэднасцю і тэмпераментам і абыграў у адборачным туры нарвежскую спявачку, прыкладна сваіх гадоў. Адзінае, што просты нарвежскі народ часта блытае Russland з Hviterussland...З 4 млн 400 тысячаў насельніцтва Нарвегіі за Рыбака прагаласавала больш 700 000 чалавек. Але — без сумневу — перажываць за ягоны выступ у Маскве будзе ўся Нарвегія. І ўсё гэта дзякуючы Чарнобылю».

**Сямён Печанко**

**Аляксандр Рыбак** нарадзіўся 13 траўня 1986 у Мінску ў сям'і музыкаў. Праз чатыры гады сям'я Рыбакоў пераехала на стала ў Нарвегію. Аляксандр у пяцігадовым узросце пачаў займацца музыкай. Уладальнік прызу Андэрса Ярэса, пераможца конкурсу «Вялікі шанец» тэлекампаніі NRK. Супрацоўнічаў з музыкам з «A-ha» Мортэнам Харкетам. За ролю скрыпача ў пастаноўцы нарвежскага тэатру Oslo Nye Teater у мюзікле «Скрыпач на даху» быў узнагароджаны прэміяй Heddaprisen. Здымаўся ў рэжысёра Грэтэ Салямонсэна — фільм «Ёган». На «Еўрабачанне-2009» патрапіў дзякуючы перамозе ў Melodi Grand Prix 2009 з песняй «Fairytale».

КАЛЯНДАР

## 100 гадоў Язэпу Найдзюку

12 мая споўнілася 100 гадоў ад нараджэння Язэпа Найдзюка (1909—1984) — выдаўца, дзякуючы якому пабачыла свет большасць заходнебеларускіх выданняў у міжваенны час.

Ён нарадзіўся ў вёсцы Бойдаты (Ваўкавыскі раён). Вучыўся Найдзюк у Ваўкавыскай настаўніцкай семінарыі і Віленскай беларускай гімназіі. Працаваў у беларускай друкарні імя Скарыны, з 1929 г. рэдагаваў часопіс «Шлях моладзі». У жніўні 1939 г. з усёй рэдакцыяй трапіў у канцлагер Картуз-Бяроза. Вызвалены Чырвонай Арміяй, працягваў працу ў беларускіх арганізацыях Вільні.

Яго нарыс гісторыі Беларусі «Беларусь учора і сёння» пяцьдзесят гадоў была адным з нешматлікіх падручнікаў для вывучэння беларускага руху.

У час другой сусветнай жыў у Мінску, быў тэхнічным кіраўніком «Выдавецтва школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі», уваходзіў у раду беларускай народнай самапомачы. «Ні аб якой калабарацыі Найдзюка не можа ісці гаворкі, — кажа гісторык Юры Туронак. — Калабарацыя — гэта праца на шкоду ўласнаму народу. А ён інспектаваў школы і выдаваў беларускія кніжкі».

Па вайне Найдзюк жыў у Польшчы, хаваючыся ад савецкіх спецслужбаў, пад імем Юзафа Александровіча. Ліставаўся з Ларысай Геніюш.

**ЛК**

«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 18—24 МАЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 18 мая, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 28 серыя
**18.55** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Давыд-Гарадзенскі» (спазнавaўчая праграма)
**19.05** «Святаслаў Фёдараў — жыццё пасля смерці», дак. фільм, рэж. Юры Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь, ч. 3: «Змагар»
**19.35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.05** «Пішчалаўскі замак», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**20.30** «Minsk-Mixt—2008», ч. 3: канцэрт гурту «Dali»
**20.40** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 9 серыя: «Расія», ч. 1
*Еўрапейскія эксперты расказваюць пра развіццё сучаснай Масквы, а таксама славутасці Падмаскоўя — Звянігараду.*
*Праграма падрыхтаваная на аснове матэрыялаў ад Еўрапейскай Камісіі.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.35** «Дом дурняў», драма, рэж. АндрэйКанчалоўскі, 2002 г., Расія.
**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 20 серыя
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

### 19 мая, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 20 серыя
**18.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Розныя светы», дак. фільм, рэж. Марка Шкоп, 2005 г., Славакія
**20.15** «Акно ў Еўропу»
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Хто ёсць кім?: Андрэй Такінданг: «...апрануўшы белую кашулю...»
*Імя чарнаскурага хлопца — Андрэя Такінданга, мастака, музыканта, паэта і выканаўцы ўласных песняў, — ужо стала вядомым у культурніцкім асяроддзі. Аўтары фільму паспрабавалі зазірнуць ва ўнутраны свет гэтай асобы. А заадно даведацца, чаму ў яго беларуская мова гучыць нязмушана, натуральна, не так, як у шмат каго з палітыкаў і тым больш чыноўнікаў, калі тыя намагаюцца выціснуць з сябе беларускае слова.*
**21.35** Форум (ток-шоу): Без права на жыццё
**22.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.50** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 21 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 20 мая, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 21 серыя
**18.55** «Далёка нам яшчэ да БНР», дак. фільм, рэж. Уладзімір Халіп, 2007 г., Беларусь
*Фільм паказвае, адкуль ідзе непрыманне цяперашнімі ўладамі Беларусі самага вядомага свята беларусаў — Дня незалежнасці Беларускае Народнае Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. Чаму Лукашэнка і ягоныя памагатыя так ненавідзяць Дзень Волі? Ідэалы першай незалежнай беларускай дзяржавы жывуць у сэрцах людзей, якія штогод святкуюць гэты дзень, хоць іх збіваюць, садзяць у турмы толькі за гістарычны бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня».*
**19.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**19.35** «Апошні сезон», серыял: 3 серыя
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Без рэтушы: «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г., Польшча
*Героі рэпартажу — тры прадпрымальнікі: хатняя гаспадыня, дырэктар прыватнага прадпрыемства і мужчына, які спрабуе вызваліць жонку з турмы. А лучыць іх адно: замест таго, каб аддацца сваёй справе, яны змушаныя займацца палітыкаю.*
*Чатыры месяцы таму хатняя гаспадыня валодала чатырма шапікамі ў цэнтры Мінску, уклаўшы ў справу каля $20 тыс., але шапікі сканфіскавала дзяржава. Раней дырэктара двойчы прызнавалі за найлепшага прадпрымальніка, ягоныя патэнты прадаваліся ў замежныя краіны, але цяпер прадпрыемства зліквідавалі, бо сканструяваны ім самалёт немагчыма збудаваць у Беларусі. Трэці герой рэпартажу разам з жонкаю меў у Наваполацку ўласную фірму. Усё працавала як след да часу, пакуль іх не пачалі дапякаць кантрольныя органы. У выніку жонку пасадзілі.*
*Але ўсе трое не здаюцца, яны не толькі поўныя рашучасці ўтрымацца на паверхні жыцця, але і актыўна змагацца за свае правы.*
**21.35** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Давыд Гарадзенскі» (спазнавaўчая праграма)
**21.40** «Ветравей», маст. фільм, рэж. Гэнры Сэфран, 1977 г., Аўстралія.
*Дзесяцігадовы хлопчык, які жыве з бацькам у запаведніку Куронг на акіянскім ўзбярэжжы Паўднёвай Аўстраліі, ратуе маленькага пелікана, бацькоў якога забілі паляўнічыя. Хлопчык і пелікан становяцца неразлучнымі, пакуль на іх сяброўства не пачынаюць уплываць абставіны.*
**23.15** «Гастарбайтар», дак. фільм, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 21 мая, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ветравей», маст. фільм, рэж. Гэнры Сэфран, 1977 г., Аўстралія.
**19.45** «Фокусная адлегласць», дак. фільм, рэж. Андрэй Куціла, 2008 г., Беларусь
**20.10** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма)
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Канцавы прыпынак», дак. фільм, рэж. Жужа Бёсэрмэні, Кай Салмінэн, 2007 г., Вугоршчына—Фінляндыя
**22.25** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**22.40** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 7 серыя
**23.35** З архіву «Jazz Jamboree»: «Гіл Эванз Оркестра», ч. 1
**00.15** Аб'ектыў (навіны)

### 22 мая, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 7 серыя
**19.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.30** «Слуцкі збройны чын», дак. фільм, 2008 г.
**20.00** Без рэтушы: «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г., Польшча
**20.25** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.35** «Завадатар», маст. фільм, рэж. Фэлікс Фальк, 1977 г., Польшча.
*Адзін з найяскравейшых узораў т. зв. «кіно маральнага неспакою». Падзеі разгортваюцца ў асяроддзі правінцыйнай эстрады. Галоўны герой, Лютэк, любым коштам прагне зладзіць баль у новаадчыненым гатэлі, бо бачыць у гэтым вялікі кар'ерны шанец, а таму робіць усё, каб арганізацыю імпрэзы даверылі яму. У сваім імкненні ён «ідзе па галовах», не шкадуючы нават найлепшага сябра...*
**23.20** «Апошні сезон», серыял: 4 серыя
**00.10** Аб'ектыў (навіны)

### 23 мая, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Два-тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, рэж. Джаан Рычардсан, 2008 г., Румынія
*Амаль праз 20 гадоў пасля падзення таталітарнай камуністычнай дыктатуры ў Румыніі пра сябе заявіла пакаленне, якое імкнецца да пераменаў. Актыўная моладзь заснавала шэраг недзяржаўных арганізацыяў. Рознымі шляхамі яны імкнуцца змяніць настроі ў грамадстве. Фільм — нізка маналогаў лідэраў і ўдзельнікаў шматаблічнага грамадскага руху, які атрымаў назву «актывізм».*
**19.40** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі на фестывалі Луцк-2007, ч. 4: выступ гуртоў «Уліс» і «Крама»
**20.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.40** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Невядомая Беларусь: «Гуканне вясны», дак. фільм, рэж. Зоя Катовіч, 2009 г., Беларусь




*Фільм расказвае пра супраціў беларускай моладзі русіфікацыі на пачатку 1980-х — праз адраджэнне народнай культуры.*
**21.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.10** Суботні сеанс: «Сміла — адчуванне снегу», маст. фільм, рэж. Біле Аў´уст, 1997 г., Данія—Нямеччына—Швецыя.
*Трагічная смерць суседскага хлопчыка здаецца Сміле Ясперсен невыпадковай. Яна пачынае ўласнае следства, збірае ўсё новыя факты, чым прымушае нейкія таямнічыя сілы ўжыць да яе самыя жорсткія захады — Сміла робіцца аб'ектам палявання...*
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

### 24 мая, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**18.15** «Ранча», серыял: 29 серыя
**19.05** «Бульбаны», мультсерыял
**19.10** «Маці знядоленых», дак. фільм, рэж. Піна Катальда, Мікеле Шанкалепорэ, 2005 г., Італія
*Фільм знаёміць з гісторыяй жыцця маці Тэрэзы, а таксама паказвае працэс яе беатыфікацыі.*
**20.10** Форум (ток-шоу): Шлюб па разліку
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім была Еўфрасіння Полацкая?» (спазнавaўчая праграма)
**21.25** «Акно ў Еўропу»
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мастацтва плакаць», маст. фільм, рэж. Пэтэр Скёнаў Фог, 2006 г., Данія.
*Вялікая сям'я Ёгансанаў мае своеасаблівае сямейнае шчасце. Галава сям'і, малочнік Гэнры, дамагаецца любові сваіх дзяцей, увесь час надзяваючы маску няшчасця. Малодшы сын Алан, каб суцешыць любага бацьку, дарує яму ўсё і дапамагае ў самых брудных справах. А дачка Санэ трывае заляцанні роднага бацькі. Да часу…*
**23.35** Фестываль «Be Free—2008», ч. 3: выступы гуртоў «Ху4» і «IQ48»
**00.05** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# ЕЎраБРСМ

Фельетон **Лёліка Ушкіна**.

У Маскву на Еўрабачанне «хварэць» за Ялфімава выправілася каманда БРСМ. Як заявіў адзін з іх правадыроў, «пазітыўныя эмоцыі заўзятараў дапамогуць зрабіць выступ Пятра Ялфімава яшчэ больш яскравым і ўражлівым». Уявім, паставяцца фанаты Пеці да чыну маладых патрыётаў.

— А хто гэта такі — Лукашэнка? — спытала дзяўчынка з татуіроўкай «Ялфімаў — мой бог» на плячы.

Яе суразмоўца, бугай з чырвона-зялёным сцягам, вырачыў вочы. Дыялог адбываўся каля пад'езду маскоўскага палацу, дзе праз пару гадзінаў меў пачацца першы тур «Еўрабачання». Менавіта сюды дэсантавалася брыгада БРСМаўцаў з Мінску. Тут жа, каля пад'езду, з ранку таміліся людзі, якія жылі ў дзіўным паралельным свеце. У свеце,дзе няма ні праблемы негатыўнага балансу замежнага гандлю, ні бітвы за ураджай, ні прынцыпу аднаго акна. Ёсць толькі адзіны чалавек — Пятро Ялфімаў! Адным словам, ягоныя фанаты.

Кумір падкаціў да будынку на сваім новым «мерсе», вакол якога адразу арганізавалася хеўра тынэйджараў. «Пятрусь, я цябе кахаю!» «О, Пеця, дакраніся да мяне!» — віскатала тарсіда.

Сябры БРСМ засталіся, дзе былі. Затое яны дружна пачалі махаць флажкамі і скандаваць «За эстрадную Беларусь!»

Ялфімаў быў вымушаны звярнуць увагу на незвычайных тыфозі і нават памахаць рукою ў напрамку таго самага бугая з сцягам.

Жэст быў перахоплены той самай дзяўчынкай з тату. Ледзь толькі Ялфімаў знік за дзвярыма, яна падруліла да адэпта моладзевага рэспубліканізму.

— Ну, каліся, што ў цябе з Пецем?

Чувак ледзь не выпусціў сцяг з рук.

— Ты што, чокнутая?

— Вы каханкі? — не адставала тая.

— Што?! Ды я цябе зараз...

— Слухай. Я за Пецю забіць магу. Ён мой. Выключна мой. Калі ў вас не любоў, то што ты тут робіш?

— Я ж казаў ужо: мы за Лукашэнку.

— Я бачыла праграму конкурсу: няма такога спевака. Гэта кампазітар? З якой краіны? Турцыі?

— Ты, што, дурная? Гэта Бацька.

— Бацька Пеці?

— Колі...

Дзяўчынка напружыла звіліны.

— Баскава?

— Слухай, ідзі адсюль і не замінай нам рабіць выступ Пятра Ялфімава яшчэ больш яскравым і ўражлівым.

— Так я і ведала. Значыцца, ты, ён і Баскаў. Вось чаму на апошнім канцэрце ён амаль не глядзеў у бок сектара, дзе сядзела я. Ах ты, разлучнік!

Дзеўка была яўна не ў сабе. Хлопец не на жарт спужаўся.

— Таварыш міліцыянер, памажыце. Мяне тут нейкая псіхапатка атакуе, — падаўся ён у бок ахоўніка парадку. Аднак было позна. Фанатка ўжо знікла.

Апантаная прагай помсты, яна кіравалася да кіёску з прэсай.

— Дайце пятнаццаць постэраў... а хоць бы і Рыбака! Так! І ўсе газеты, дзе пра яго пішуць! І што я знайшла ў тым Ялфімаву?



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Дзяўчына ў купальніку мые Porsche Carrera S на міжнародным аўтасалоне «Матаршоў» у Мінску.**

## ЖАРТЫ

* * *

Заўтра ад 08.00 да 17.00 адбудзецца суботнік. Яўка ўсіх, хто выказаў жаданне, — абавязковая. Усім, хто не выказаў жадання, — паведаміць пра сваё нежаданне і прадставіць дакументальнае пацверджанне з абгрунтаваннем нежадання. Спісы тых, хто не жадае, будуць прадстаўленыя адміністрацыі, і ім за гэта нічога не будзе. Чаго ім не будзе, адміністрацыя вырашыць пазней.

* * *

Аўтааматару да ведама: пабачыў на вуліцы дзяўчат у кароткіх спадніцах? Час мяняць гуму на колах!

* * *

Ліст ад сябра з войска: «Нас тут вучаць чысціць снег і абіраць бульбу. Так што, калі вораг нападзе — мы яму дарогу расчысцім і есці зварым».

* * *

Улада заўжды ідзе побач з бізнесам — такі парадак канваявання.

* * *

— Скажыце, а надзіманы ложак — гэта зручна ці не?

— Калі лёгкія слабыя — нязручна.

## КАДРЫ



**Новы знак: «Асцярожна! Нізкія верталёты».**

**Заўважыў ЛК**

## ЖАРТЫ

### Якуб Колас як гарачы замарожаны Ленін

Мінск, плошча Якуба Коласа, дзіця залезла на помнік пісьменніку, нагрэты сонцам:

«Гарачы які... Ленін».

Само сабой. Калі помнік, то абавязкова Леніну. Іншыя дзеці абмяркоўваюць пытанне паходжання помніку:

«Гэта быў такі вялікі чалавек, потым прысеў тут і яго замарозілі». — «Не, — пярэчыць дзяўчынка, — ён проста памёр!»

### Харошанькі хлопчык Віця Грэбенштэйн

Малады чалавек кажа камусьці па мабільніку: «Шо, ты мяне не памятаеш? Ну, Віця Грэбенштэйн, чорненькі такі, харошанькі хлопчык...»

community.livejournal.com/overheard_by

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАЦОЎНАЯГРУПА

**Утвараецца** працоўная група для складання іспанска–беларускага, беларуска–іспанскага слоўніка. Зацікаўленых просім звяртацца праз т.: (029) 629–92–22 або на u_dziadow@yahoo.com (Уладзімір Дзядоў)

### СПОНСАР

**Шукаю спонсара**, юрыста для рэгістрацыі гандлёвай маркі «Беларускае паветра» і вытворчасці адпаведнай (сувенірнай) прадукцыі (ад мяне — дызайн і арганізацыйная праца). sk2000@tut.by, (029) 597–09–68

### ПРАЦА

**Шукаю** сталую працу рэдактара альбо стыль–рэдактара. Стаж працы — шэсць гадоў. Т.: (017) 286–45–73, (044) 704–82–71 (Эдвард)

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**М.Даўгінава, Віленск. губ.** Прыехаў доктар Хург; ён не бярэ саўсім грошай ад бедных, ідзе да кожнага, хоць апоўначы. Цяпер доктар хацеў зрабіць з горадам кантракт, каб яму плацілі ў год 700 руб., а калі ісці да хворага ў хату, дык за раз 20 кап., да беднага — дарма. Жыхары надумалі зрабіць гэтак: яны пастанавілі, што дрожджы можна купляць толькі ў адной краме, і ўвесь даход з гэтага будзе ісці доктару, каб ён мог пражыць.

**В.Сос-скі**

**«Наша Ніва». №18. 1909**

Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5715. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 12.05.2009.
Замова № 2524.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.
Цана дамоўная.
ISBN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12